№ 44 (498) 1 сьнежня 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

У НУМАРЫ

**Справа Моніча**

Упершыню за мяжою затрыманы беларускі агент. **Старонка 7.**

**Памежнікі далі Мілінкевічу 32 гады**

Лідэра Дэмакратычных сілаў абвінавацілі ў «перасячэньні мяжы па несапраўдных дакумэнтах». **Старонка 6.**

**«Галадоўка як прыкмета часу»**

Што думаюць пра галадоўку сьвятара Аляксандра Шэмета і ягоных парафіянаў каталіцкія, пратэстанцкія, уніяцкія сьвятары й каталіцкія інтэлектуалы? **Старонка 8.**

**Гонка з выбываньнем**

Ці нясуць спартоўцы адказнасьць за сыстэму? Нясуць, — піша Віталь Тарас з нагоды нявыдачы візаў беларускім футбалістам. **Старонка 10.**

**Страшная сьмерць Аляксандра Літвіненкі**

Сьляды радыяактыўнага палёнія знайшлі ў пяці месцах, куды завітваў Літвіненка да шпіталізацыі. **Старонка 21.**

**Рэкорды лістапада**

27 лістапада ў Менску абсалютны тэмпэратурны максымум быў перавышаны на 1 градус. **Старонка 23.**

# Пуцін ставіць перад фактам



Насуперак мінулатыднёвым дэклярацыям Аляксандра Лукашэнкі пра неабходнасьць перамоўнае ацэнкі кошту «Белтрансгазу», Пуцін перад адлётам зь Менску заявіў пра стварэньне СП на парытэтных умовах на базе ацэначнага кошту як справу вырашаную. Ці значыць гэта, што беларускае кіраўніцтва капітулявала? Старонка 3.

**Самы правальны з самітаў СНД**

Палітычная пустка, дэмарш расейскіх журналістаў. **Старонка 3.**

**Кіраўнік Беларусі гатовы стварыць саюзную дзяржаву з Украінай**

«Такая дзяржава магла б многа вытаргаваць для сваіх народаў». Рэпартаж у цытатах з прэс-канфэрэнцыі Аляксандра Лукашэнкі для ўкраінскіх журналістаў. **Старонка 4.**

**Як нам захаваць СНД?**

Фэльетон Лёліка Ушкіна. **Старонка 16.**

## Паважаны спадар Андрэй Дынько і калектыў Рэдакцыі «Наша Ніва»!

**Шчыра віншуем вас са сьвяткаваньнем сёньня 100-гадовага юбілею са дня публікацыі першага нумару газэты «Наша Ніва».**

Дзякуем вам за глыбокія артыкулы, далёкія ад палітычнага радыкалізму і фанатызму. Такая асьцярожная пазыцыя, якая не ўмяшчаецца ў рамкі прынятай палітычнай дактрыны на пэўны гістарычны пэрыяд, наканавала газэце адпаведны лёс. Да 1917 году «Наша Ніва» ставілася крытычна да царскай, а пасьля 1917 — да савецкай улады, за што цярпела ад абедзьвюх. Шкадуем, што ў апошні час у вашай газэце зьявіліся праблемы з распаўсюджваньнем і юрыдычнай рэгістрацыяй, уключаючы нядаўняе папярэджаньне Міністэрства інфармацыіі.

Мы спадзяемся, аднак, што ўнікальная гістарычная роля «Нашай Нівы» ў культурным і палітычным жыцьці Беларусі будзе заўсёды годна ацэнена грамадзтвам, а газэта будзе і наступныя 100 гадоў цешыць чытачоў сваімі артыкуламі.

Асобна віншуем спадара Андрэя Дынька за атрыманьне прэміі «Свабода выказваньня»!

З павагай,

**Амбасадар Оке Пэтэрсон, ад імя Офісу АБСЭ ў Менску**

## Шаноўная Рэдакцыя газэты «Наша Ніва»!

**Віншуем шаноўных калегаў з 100-гадовым юбілеем.** Ганарымся, што амаль усе тэвээлаўцы супрацоўнічалі, а іншыя працягваюць супрацоўнічаць зь легендарным беларускім пэрыёдыкам. Зычым вам трываласьці, веры і дзейснай падтрымкі папярэднікаў, айцоў «Нашай Нівы».

Як і 100 гадоў таму, на вас, нашаніўцах, ляжыць вялікая адказнасьць. Памятайце пра гэта.

Будзем разам. Мусім годна прайсьці найноўшы беларускі шлях.

**Ад сяброў Таварыства Вольных Літаратараў: Алесь Аркуш, Вінцэсь Мудроў, Юры Гумянюк, Юрась Пацюпа**

## Віншую нашаніўцаў са слаўным юбілеем!

Зычу таленавітых аўтараў, удзячных чытачоў-падпісчыкаў, росту накладу й папулярнасьці выданьня!

**Уладзімер Сіўчыкаў**

## Паважаная Рэдакцыя

Плёну, імпэту, спагады, сілаў і аднадумцаў вам! за100емся!

**Аляксей Бацюкоў, Магілёў**

## Паважаная Рэдакцыя!

**Віншую вас і «НАШУ НІВУ» з такім цудоўным юбілеем – 100 год!**

Жадаю захаваць старыя, добрыя традыцыі! І — новых зьдзяйсьненьняў ды адкрыцьцяў!

З павагай,

**Дар'я Ліс, Смаргонь**

## Віншую зь юбілеем!

Зычу росквіту й плёну ў працы!

**Аляксей Колчын, Магілёў**

## 100 год «Нашай Ніве»

**Стагодзьдзе таму нашыя папярэднікі заснавалі тое, што сталася апірышчам усёй беларушчыны, зрабілася яе падмуркам.** Падмуркам дому, на дзялянцы Багушэвіча.

Як бы там ні было, але за тыя першыя гады існаваньня «НН» была абуджана вялікая хваля беларусізацыі, што адрадзілася амаль зь ніадкуль. Тая хваля пасьля здолела за наступнае дзясяцігодзьдзе выставіць сьцены тае беларускай хаткі, якая пасьля пратрывала болей паўвеку. Стаіць дасюль.

Сто год гэты будынак спрабавалі зачыніць, зьнішчыць, выпаліць і спляжыць. Колькі разоў падавалася, што ён лясьне. Што зарасьце пустазельлем нават падмурак і нічога ўжо не нагадае пра наш дом. Пра нашу Беларусь. Але добра, відаць, быў заліты падмурак, моцная была цэгла ў сьценах…

Нам наканавана (а мо і пашчасьціла) толькі ўладкоўваць, аздабляць той дамок у сярэдзіне. У марах — зрабіць эўрарамонт.

Але сёньня нашаму падмурку, нашай «НАШАЙ НІВЕ» 100 год.

Усіх супрацоўнікаў «НН» і ўсіх чытачоў віншую з гэтай гадавінай. Мы разам перажываем усё наступствы і віхуры часу і злых людзей.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## Шчыра віншуем

аўтараў і чытачоў «Нашае Нівы» зь юбілеем. Зычым плёну ў працы, натхненьня і мужнасьці.

**Сайт «Нашыя дзеткі»**

**Віншую са стогадовым юбілеем Рэдакцыю ўзноўленай «Нашай Нівы».** Творчага плёну. Жыве Беларусь!

**Ала (Альбіна) Сямёнава, Менск**

## Шчыра віншую

вас з гэтым сьвятам! Хочацца пажадаць толькі аднаго — не спыняцца і далей рабіць сваю працу. Вялікі дзякуй Вам за тое, што змагаецеся за «Нашу Ніву».

**Чытач**

## Дарагія сябры!

**У мяне 23 лістапада двайное сьвята, бо менавіта ў гэты дзень нарадзіліся мае дзеці, як я жартую, «блізьняты з розьніцай у шэсьць гадоў».** А сёлета сьвята трайное, таму што юбілей «Нашай Нівы» — гэта таксама дарагая і блізкая майму сэрцу дата. Шчыра віншую калектыў Рэдакцыі са 100-годзьдзем першай беларускай газэты. Дзякуй вам за тое, што насуперак усім цяжкасьцям высока трымаеце сьцяг беларускасьці, за надзею і радасьць, якую прыносіць кожны новы нумар. Посьпехаў вам і нашай супольнай справе. Трымайцеся! Жыве Беларусь!

**Валянціна Гракун, Бешанковічы**

## Шаноўнае спадарства!

**Віншую ўсіх нашаніўцаў і чытачоў са стагодзьдзем газэты нашае душы!** Зычу, каб беларускі Мінатаўр, імя якому самота, быў урэшце пераможаны! Вытрымкі і плёну! Радасьцяў вялікіх і яшчэ большых!

**Сяргей Балаханаў, Гомель**

## Мілая «Наша Ніва»!

**Дзякуй Табе, што Ты ёсьць... і будзь неўміручай!** А нашаніўцам зычу трываньня, натхненьня і апантанасьці. Творачы — зруйнуем (...спагадай Божа!). Усіх цёпла-цёпла абдымаю і віншую.

**Наталька Харытанюк, Менск**

## Шаноўны рэдактар газэты «Наша Ніва» сп.Андрэй Дынько!

**Паважаны калектыў Рэдакцыі і ўсе прыхільнікі беларускага Слова!**

Віншую Вас усіх з стагодзьдзем выхаду першага нумару газэты «Наша Ніва». Прайшло сто год, але нічога ў сьвеце і ў Беларусі не зьмянілася. І гэта сымбалічна: газэту забаранялі чытаць у 1906 годзе, тое ж робяць беларускія ўлады і цяпер. Але калектыў газэты «Наша Ніва», нягледзячы на вялікія цяжкасьці і перашкоды на сваім шляху, усё роўна працягвае працаваць на карысьць Адраджэньня Беларусі, бо «Наша Ніва» — гэта газэта, якая абуджае нацыянальную самасьвядомасьць кожнага, хто чытае яе, і нагадвае праз зьместоўныя нататкі нам пра тое, што мы — старажытны народ. Непрыяцелі хацелі заняволіць Беларусь, хацелі зьнішчыць усё беларускае. Але народ ня змог забыць свае нацыянальныя сымбалі: герб Пагоню і бел-чырвона-белы сьцяг. І ў гэтым ёсьць немалая заслуга газэты «Наша Ніва», дзе працуюць сапраўдныя патрыёты, якія штодня і штохвілінна жывуць дзеля Маці-Радзімы, дзеля роднага крывіцкага Слова.

Я веру ў тое (і чакаю той час!), калі «Нашу Ніву» будуць чытаць у кожнай беларускай хатцы, у кожнай беларускамоўнай сям'і.

Зычу ўсяму калектыву Рэдакцыі газэты «Наша Ніва» дабра, шчасьця, здароўя, трываласьці і творчага натхненьня на карысьць Бацькаўшчыны, на карысьць беларускага Адраджэньня. Жыве вольнае і незалежнае беларускае Слова! Жыве Беларусь!

Заўсёды Ваш,

**Юры Мянькоў, настаўнік баравабудзкай школы Карманскага р-ну Гомельскай вобласьці**

## Паважанае Спадарства!

Далучаюся да ўсіх віншаваньняў з нагоды стогадовага юбілею «Нашай Нівы», і маёй улюбёнай газэты!

Са шчырай павагаю,

**Вадзім Болбас, Сьветлагорск**

«НН» з радасцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

# Самы правальны з самітаў СНД

**Мэмарандум пра ўзаемаразуменьне адклалі на пасьля — пакуль ня вырашаць, як рэфармаваць СНД. Крамлёўскі пул журналістаў адмовіўся асьвятляць падзеі саміту ў знак пратэсту супраць нядопуску шэрагу карэспандэнтаў беларускім бокам. У якасьці іншага заходу ў адказ беларускіх журналістаў не пусьцілі на прэс-канфэрэнцыю Пуціна. Тым часам беларуская сталіца задыхалася ў заторах — цэнтар гораду быў перагароджаны.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Аляксандар Лукашэнка на адкрыцьці саміту заявіў пра неабходнасьць распрацоўкі прадуктыўнай мадэлі садружнасьці. Аднак ягоныя словы не былі пачутыя.

Расейскі бок прапанаваў выключыць з парадку дня паседжаньня прапанаваны Ўкраінай мэмарандум пра ўзаемаразуменьне. На думку расейскага боку, дадзены дакумэнт можна разглядаць толькі пасьля прыняцьця рашэньня пра рэфармаваньне СНД. Астатнія дэлегацыі пагадзіліся з думкай Расеі. Расея таксама заблякавала прыняцьце ўсіх эканамічных дакумэнтаў.

Спадзяваная сустрэча Пуціна з Саакашвілі так і не адбылася.

Адзіным плёнам ад саміту стала рашэньне Расеі спыніць эмбарга на малдаўскія віны. А таксама трохбаковая сустрэча кіраўнікоў Беларусі, Украіны і Азэрбайджану — першая ў такім фармаце.

Галоўную ж навіну дня зрабілі не постсавецкія аўтакраты, а журналісты.

Расейскія журналісты, акрэдытаваныя на сустрэчы прэзыдэнтаў СНД, пакінулі саміт і адмовіліся асьвятляць яго. Гэты дэмарш «крамлёўскага пулу» — гэта значыць, журналістаў, якіх дапускаюць на мерапрыемствы з удзелам прэзыдэнта Расеі — быў акцыяй салідарнасьці з карэспандэнтамі «Московского комсомольца» і «Коммерсанта», выданьняў, крытычных да беларускай адміністрацыі, якіх не дапусьцілі на сустрэчу.

Прадстаўнік прэсавай службы прэзыдэнта Расеі паведаміў, што на саміце засталіся толькі два прадстаўнікі мэдыяў, «каб грамадзкасьць ведала, што адбываецца на саміце».

Кіраўнік расейскага саюзу журналістаў Ігар Якавенка патлумачыў у інтэрвію радыё «Свабода», што «ўсе журналісты прэзыдэнцкага пулу падтрымалі сваіх калегаў» і што «расейскія ўлады не дазваляюць сабе такога хамства адносна журналістаў».

Увечары скандал разросься. Прэзыдэнт Расеі не зьявіўся на выніковай прэсавай канфэрэнцыі саміту. Ён абмежаваўся кароткай сустрэчай з журналістамі ў аэрапорце «Менск-2». Пры гэтым прэсавая служба прэзыдэнта Расеі забараніла беларускім журналістам прысутнічаць на ёй. Беларускія і расейскія журналісты

**Працяг на старонцы 4.**

# Пуцін ставіць беларусаў перад фактам

28 лістапада пасьля сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам Уладзімер Пуцін заявіў пра стварэньне СП на парытэтных умовах як вырашаную справу. Незалежная ацэнка «Белтрансгазу» завершаная, сказаў ён, і «мы загадзя дамовіліся зь Беларусьсю, што якой бы гэтая ацэнка ні была, мы будзем абодва [менавіта абодва — не абедзьве краіны, а абодва прэзыдэнты] зь ёю згодны». Паводле Пуціна, частка цаны за газ для Беларусі ды іншых замежных партнэраў Расеі будзе капіталізаваная ў кошт «Белтрансгазу». Канкрэтныя парамэтры будуць узгодненыя на карпаратыўным узроўні.

Гэтыя безапэляцыйныя заявы супярэчаць нядаўнім словам А.Лукашэнкі пра неперадвырашанасьць справы і неабходнасьць вызначэньня кошту шляхам перамоваў.

Паводле інфармацыі эканаміста Яраслава Раманчука, галяндзкі банк ABN Amro ацаніў «Белтрансгаз» на $4 млрд. Колькі год таму беларускі бок у перамовах з Расеяй называў лічбу 5 млрд, а 13 лістапада Лукашэнка ацаніў газатранспартную сыстэму ўтрая даражэй.

Ацэнцы галяндзкім банкам актываў «Белтрансгазу» папярэднічала заява беларускага прэм'ера пра стварэньне СП на базе беларускага і расейскага газавых манапалістаў.

Эканаміст Уладзімер Калупаеў ня раіць ставіцца да словаў расейскага лідэра як апошняй інстанцыі. На яго думку, бакі ўцягнуліся ў інфармацыйную вайну. Аднак перавага цалкам на баку Масквы. Яна дазваляе сабе размаўляць зь Беларусьсю як з васалам. Можна заўважыць, што аўторкавы дэмарш журналістаў каардынаваўся прэсавай службай Пуціна. У сераду Беларусь чакала яшчэ аплявуха: расейскі прэм'ер Фрадкоў адмовіўся прыняць Сяргея Сідорскага.

Жорсткаму патрабаваньню Ўладзімера Пуціна беларускім уладам няма чаго проціставіць. Шляхі паставак энерганосьбітаў з Цэнтральнай Азіі ці Эўропы не наладжаныя, краіна застаецца ў міжнароднай ізаляцыі. 29 лістапада міністар замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў пасьпяшаўся пацьвердзіць гатоўнасьць Беларусі стварыць СП цягам месяца і заверыў, што Беларусь не шукае альтэрнатывы расейскім энерганосьбітам.

Пуцін сваёй заявай папросту жорстка паставіў беларусаў перад інфармацыйным фактам. Калі беларускі ўрад заўпарціцца, расейская грамадзкасьць будзе лічыць, што парушаюцца ранейшыя дамоўленасьці. Беларускае кіраўніцтва заганяюць у кут.

**Сямён Печанко, Мікола Бугай**

Працяг са старонкі 3.

падышлі да VIP-залі, аднак беларускім забаранілі ўваходзіць у яе. Гаворка ідзе пераважна пра супрацоўнікаў беларускіх дзяржаўных СМІ.

Іншае значнае пасланьне саміту СНД прыйшло з Кіева. Вярхоўная Рада Ўкраіны прыняла рашэньне прызнаць Галадамор 1932-33 гадоў генацыдам украінскага народу. Тады ў выніку сталінскае палітыкі загінула ад голаду некалькі мільёнаў чалавек. Нягледзячы на супраціў камуністаў і Партыі Рэгіёнаў, пастанова прайшла 233 галасамі «за» ў варыянце, прапанаваным прэзыдэнтам Украіны Віктарам Юшчанкам з папраўкамі лідэра сацыялістаў, сьпікера парлямэнту Аляксандар Мароза. Расея, што ганарыцца пераемнасьцю з савецкай спадчынай, засьцерагала Ўкраіну ад прыняцьця такога рашэньня.

Увесь час саміту беларуская сталіца задыхалася ў затарах. Цэнтар Менску ператварыўся ў суцэльны корак. Аўтамабілісты пераставалі зважаць на правілы, перакрывалі скрыжаваньні, ехалі на чырвонае. Рэгуліроўшчыкаў амаль нідзе не было.

Акрамя таго, каля 17-й перакрылі станцыі «Кастрычніцкая – Купалаўская» і Кастрычніцкую плошчу ад вуліцы Янкі Купалы, і ўвесь народ рынуў на суседнія станцыі. Рэч у тым, што на Плошчы а 19-й мела адбыцца акцыя салідарнасьці з палітвязьнямі.

# Лукашэнка гатовы стварыць

«Такая дзяржава магла б многа вытаргаваць для сваіх народаў», – сказаў ён. Рэпартаж у цытатах з прэс-канфэрэнцыі Аляксандра Лукашэнкі для ўкраінскіх журналістаў.

Напачатку кіраўнік Беларусі зрабіў невялічкую гістарычную рэмінісцэнцыю, згадаўшы, што беларусы разам з украінцамі перамагалі ў Кулікоўскай бітве, бітве пад Палтавай, Другой сусьветнай вайне. Паміж Беларусьсю і Ўкраінай не існуе значных супярэчнасьцяў і рознагалосьсяў, а нашыя краіны цяпер не жывуць разам праз амбіцыі кучкі палітыкаў, якія развалілі Савецкі Саюз.

Лукашэнка зрабіў камплімэнт беларускай мэдыцыне, сказаў, што ў Беларусі спрабуюць захаваць і не разбураюць гістарычныя помнікі, а ўзводзяць новыя, такія як Лінія Сталіна ці Нацыянальная бібліятэка.

«Апошнія выбары мы фальсыфікавалі, — прызнаўся ён. — За Лукашэнку прагаласавала 93 з паловай працэнта. Але, кажуць, гэта не эўрапейскі паказчык. Мы зрабілі 86%».

Увогуле ён вёў гутарку ва ўласьцівай яму манеры. Стваралася ўражаньне, што ён зараз хоча выйсьці на ўкраінскую палітычную сцэну.

### У Заходняй Украіне таксама жывуць нашы людзі

«Як бы яна [Украіна] ні супраціўлялася, але давядзецца актыўна супрацоўнічаць зь Беларусьсю і Расеяй. Нават калі яна імкнецца ў ЭЗ і НАТО». «Але калі ў НАТО Ўкраіне будзе цяплей, то мы ня супраць».

### Мы стваралі ў Сібіры газавыя радовішчы

«Ня важна, колькі будзе каштаваць газ у Беларусі, 50 ці 120 даляраў, галоўнае – каб цэны ў Беларусі і Расеі былі аднолькавымі. Калі ня будзе раўнапраўя, то саюз разваліцца праз некалькі гадоў... Мы, беларусы і ўкраінцы, стварылі ў Сібіры газавыя і нафтавыя радовішчы, але пасьля развалу СССР нічога не атрымалі. Таму дайце нам магчымасьць здабываць той газ і нафту ў Расеі. Справа ня ў цэнах, справа ў адносінах».

### Беларусь ня рвецца ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю

«Уступім мы туды ці ня ўступім — мы ўсё адно акажамся там».

### Вы — маленькія, мы – вялікія

На пытаньне карэспандэнта «Дня» пра магчымасьць будаўніцтва саюзнай дзяржавы з Украінай, Лукашэнка адзначыў, што «гэта будзе ня горшы з варыянтаў, бо ня будзе прэтэнзій: вы маленькія, мы вялікія».

### Пра мадэль разьвіцьця

«Я далёкі ад ілюзіяў, што ў нас усё добра».

### Я прыйшоў да ўлады і пачаў кіраваць, ...як сапраўдны бацька сям’і

«Мая палітыка гэта не палітыка інтэлігенціка, які выйшаў з інтэлегентнай сям’і, дзе за сталом сэрвіруюць лыжкі сюды, відэльцы сюды. Я прыйшоў да ўлады і пачаў кіраваць, як умею. Часам бізуном, часам пернікам, як сапраўдны бацька сям’і».

### У дыктатуры ёсьць нешта добрае

«Я не падабаюся шмат каму на Захадзе, таму яны на мяне і абзываюцца. У дыктатуры ёсьць нешта добрае, таму мы не кампелексуем праз гэта».

### Янка Брыль бачыў жыцьцё праз мову, а я не зацыкліваюся

«Янка Брыль і іншыя пісьменьнікі бачылі жыцьцё толькі праз мову, мову, мову, а я не зацыкліваюся на гэтым пытаньні. Для мяне гэта не галоўнае пытаньне. Мы адрадзілі сваю родную мову. Пры нацыяналістах у ВНУ сачыненьні пісалі толькі 15% студэнтаў, пры Лукашэнку цяпер такіх большасьць. Апроч мовы ёсьць яшчэ багата праблемаў. Украінская ж мова адна з маіх любімых, яна вельмі прыгожая».

### Ля «Макдональдзу» раней часта сядзела бабка. Мая служба аховы сустрэлася зь ёй...

«Крутыя іншамаркі ў нас бываюць, толькі калі да нас прыязджаюць з Расеі ці Ўкраіны, але і ў нас зьяўляюцца «Хамэры» і «Бэнтлі». Калі ты хочаш зарабіць нармальныя грошы, то ў Беларусі гэта магчыма. Што датычыць бедных, то трэба паглядзець, што гэта за бедныя, часам гэта звычайныя злачынцы. Ля «Макдональдзу» раней часта сядзела бабка, якую я ня раз бачыў. Мая служба аховы сустрэлася зь ёй і пераканалася, што яна зусім ня бедны чалавек. У Менску ўжо не засталося бамжоў, гадоў шэсьць таму яшчэ былі, цяпер няма. У нас няма недагледжаных дзяцей».

### Таваразварот падскочыў

Са Злучанымі Штатамі таваразварот падскочыў амаль у два разы, а з Эўразьвязам у 3 разы за апошнія тры гады.

### У нас свой «МАЗ»

Нашто нам адкрываць вытворчасьць «Мэрсэдэсаў»? У нас свой «МАЗ». Нашто нам вытворчасьць «Катэрпілераў», у нас свой «Бе-

Акцыю разагнала міліцыя ад самага яе пачатку.

Са словаў Насты Палажанкі, байцы АМОНу вырывалі юнакоў з ланцугу і кідаць на прыступкі падземнага пераходу.

Расейская gazeta.ru назвала аўторкавы саміт СНДу Менску самым правальным за гісторыю Садружнасьці.

**Мікола Бугай**

# Лукашэнка: 2007 год будзе катастрафічна цяжкім

Кіраўнік краіны згадвае Ломаця, гаворачы пра ўратаваньне эканомікі ад энэргетычнага крызісу.

Аляксандар Лукашэнка заявіў на нарадзе з урадам, што наступны год будзе вельмі цяжкім для краіны. На думку прэзыдэнта, выйсьцем зь цяжкага стану ў сувязі з павышэньнем цэнаў на расейскія энэрганосьбіты можа быць павелічэньне вытворчасьці і продаж тавараў за мяжой.

«Гэта будзе вельмі цяжкі год, будзе катастрафічна цяжка». «Я заклікаю ўсіх – і Шэймана, і Сідорскага, і Пракаповіча, і Ломаця працаваць у кірунку Вэнэсуэлы, Ірану, Азэрбайджану», – заклікаў Лукашэнка ўсіх найвышэйшых чыноўнікаў.

**МБ; telegraf.by**

# саюзную дзяржаву з Украінай

лАЗ».

**Беларусь па карупцыі займае ня першае месца**

«Па карупцыі ў сьвеце прызнаюць, што Беларусь займае ня першае месца. Беларусь — гэта не карумпаваная дзяржава».

**Некалі расстрэльвалі проста на месцы**

«Некалі ў нас была сапраўдная схватка. Некаторых [крымінальных аўтарытэтаў] расстрэльвалі проста на месцы, цяпер тут цішыня і спакой».

**Тры кіты дзяржаўнай ідэалёгіі**

«Грошы, улада, уласнасьць».

**Я паймення ведаю ўсіх таленавітых журналістаў**

«У нас краіне большасьць СМІ недзяржаўныя, але самыя магутныя, натуральна, дзяржаўныя, і мы ім дапамагаем. Я паймення ведаю ўсіх таленавітых беларускіх журналістаў. Я ім вельмі ўдзячны за падтрымку, якую мне аказваюць беларускія СМІ».

**Каб не Гарбачоў, не было б і Лукашэнкі**

«Да гэтага чалавека можна ставіцца па рознаму, але, каб не Гарбачоў, не было б і Лукашэнкі. Бо прэзыдэнт ведаў і чуў некалі маладога дэпутата».

**Дай Бог кожнаму прэзыдэнту такую апазыцыю**

«Дай Бог кожнаму прэзыдэнту такую апазыцыю, як у Беларусі. Самыя ўдалыя апазыцыянэры ў Беларусі – гэта тыя, хто ўцёк некалі ад Лукашэнкі. Апазыцыя павінна быць у кожнай краіне».

**Мы ўсе п’ём**

Пра антыалькагольную кампанію: «У нас такой няма. Мы ўсе п’ём. Ня меней вашага. Лепш хай піва вып’е чалавек, чым нейкай барматухі».

**Ніяк не магу звыкнуцца, што палітыка няшчырая**

«Я ніколі ня думаю, што палітыка такая няшчырая. Я ніяк не магу да гэтага звыкнуцца».

**Чавэс**

«Гэта вельмі талковы і адукаваны чалавек, які імкнецца стаць лідэрам усёй Лацінскай Амэрыкі».

**Пераемнік**

«Я катэгарычна супраць такіх рэчаў, калі вы намякаеце на маіх сыноў, то гэта абсурд і глупства».

**Пра ўкраінцаў**

«Гэты народ не заслугоўвае таго становішча, у якім ён апынуўся».

**Апошнія выбары мы фальсыфікавалі**

«Апошнія выбары мы фальсыфікавалі. За Лукашэнку прагаласавала 93 з паловай працэнта. Але, кажуць, гэта не эўрапейскі паказчык. Мы зрабілі 86 %», – заявіў



**Ідэі Балта-Чарнаморскага нафтавага калектару актуалізавалі іх колішнія крытыкі.**

А.Лукашэнка. Па яго словах, з боку Еўропы напярэдадні выбараў гучалі абяцаньні, што ў выпадку, калі «будзе прыкладна эўрапейскі паказчык на выбарах, выбары будуць прызнаныя». «Але таксама не атрымалася. Паабяцалі, што прызнаюць, але не прызналі».

**Эпілёг**

«Я не дамагаўся шкурных інтарэсаў».

**Запісаў Зьміцер Панкавец**

# Памежнікі далі Мілінкевічу 32 гады

Лідэра Дэмакратычных сілаў абвінавацілі ў «перасячэньні мяжы па несапраўдных дакумэнтах».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У сераду ўвечары Мілінкевіча затрымалі ў Нацыянальным аэрапорце «Менск-2», калі ён вяртаўся з Рыскага саміту НАТО, дзе сустракаўся з прэзыдэнтамі Бушам і Віке-Фрайбэргай. Памежнікі й супрацоўнікі ў цывільным заявілі Мілінкевічу, што ягоныя дакумэнты не ў парадку.

У Мілінкевіча законны пашпарт, зь якім ён легальна выехаў у Рыгу і шмат падарожнічае, таму ягоны прэсавы сакратар адразу назваў выпадак правакацыяй і псыхалягічным ціскам напярэдадні паездкі экс-кандыдата ў прэзыдэнты ў Страсбург на сэсію Эўрапарлямэнту. Там Мілінкевічу маюць уручыць прэмію імя А.Сахарава.

А сутнасьць справы анэкдатычная. Калі Мілінкевіч вылятаў у Рыгу, то памылкова аддаў памежнікам ня свой пашпарт, а пашпарт сына – таксама Аляксандра Мілінкевіча, але Аляксандравіча і 1974 году нараджэньня. Сынаў дакумэнт ляжаў у бацькі выпадкова ў адной кішэні зь ягоным. Памежнікі, мусіць, не зьвярнулі ўвагі, што Мілінкевіч на 25 гадоў старэйшы за адзначаны ў дакумэнце ўзрост, што ў пашпарце няма латвійскай візы, дый блямбнулі штамп. Сам Мілінкевіч выявіў, што яму паставілі штамп у пашпарт сына, толькі ў Рызе. Гэты выпадак у аўторак як анэкдот гуляў па менскіх палітычных і дыпляматычных калідорах.

Варта нагадаць, што Мілінкевіч удзельнічаў у Рызе ў саміце на запрашэньне прэзыдэнта Латвіі Вайры Віке-Фрайбэргі. Падчас саміту ён меў кароткі абмен думкамі з прэзыдэнтам ЗША Джорджам Бушам і грунтоўныя гаворкі зь вядомымі палітолягамі Зьбігневам Бжазінскім (ЗША) і Сяргеем Караганавым (Расея).

Пасьля трох гадзінаў затрыманьня Мілінкевіча вызвалілі, але яго чакае суд. Сусьветна вядомага палітыка, які сёлета сустракаўся з большасьцю эўрапейскіх лідэраў, абвінавацілі ў наўмысным перасячэньні мяжы па несапраўдных дакумэнтах. Па гэтым абвінавачваньні яму пагражае вялікі штраф або папраўчыя работы да 2-х месяцаў.

**Сямён Печанко**

# Дэкрэт №18: ні суду, ні Канстытуцыі

24 лістапада Аляксандар Лукашэнка падпісаў дэкрэт №18 «Аб дадатковых захадах па дзяржаўнай абароне дзяцей зь неўладкаваных сем'яў». Дакумэнт прадугледжвае пазасудовае адабраньне дзяцей, чые бацькі вядуць амаральны лад жыцьця. Праваабаронцы цьвердзяць пра чарговае парушэньне Канстытуцыі ды міжнародных нормаў.

Галоўная асаблівасьць дакумэнту, які ўступіць у сілу 1 студзеня — гэта фактычная адмена арт. 32 Канстытуцыі, які прадугледжвае адабраньне дзяцей у «ненадзейных бацькоў» толькі паводле судовага рашэньня. Цяпер жа рашэньне аб адабраньні дзяцей прымаецца камісіяй па справах непаўналетніх у трохдзённы тэрмін са дня атрыманьня адпаведнага сыгналу. Пры гэтым дастаткова толькі паведаміць пракурору.

Дакумэнт прадугледжвае жорсткія захады, якія забясьпечваюць поўнае спагнаньне зь ненадзейных бацькоў выдаткаў дзяржавы па ўтрыманьні дзяцей. Выдаткі на выхаваньне дзяржавай дзяцей спаганяюцца з заробку бацькоў, калі яго не стае — дзяржава мае права выкарыстаць маёмасьць гэтых грамадзянаў.

Паводле афіцыйных крыніцаў, чарговы дэкрэт скіраваны на абарону дзяцей зь ненадзейных малазабясьпечаных сем'яў. Між іншым, існуюць некаторыя прыкметы таго, што дадзены дэкрэт можа быць ужыты таксама дзеля запалохваньня палітычна актыўных грамадзянаў. Так, непаўнагадовы моладзевы актывіст з Салігорску Іван Шыла сьцьвярджае, што ў часе аднаго з апошніх затрыманьняў яму пагражалі тым, што адбяруць яго ў бацькоў. Яго бацька, Уладзімер Шыла, аднак, пэўны, што сёньняшняя ўлада не такая ўсёмагутная, як савецкая, але ў выпадку чаго гатовы бараніць свае правы і правы сваіх дзяцей.

Праваабаронца Валянцін Стэфановіч не выключае магчымасьці «палітычнага» выкарыстаньня дэкрэту ў пэўных умовах: «Наўрад ці гэта прымяняльна да сям'і Шылаў, бо дэкрэт у першую чаргу скіраваны супраць асацыяльных асобаў, што нясуць пагрозу жыцьцю і здароўю сваіх дзяцей».

Сп. Стэфановіч кажа, што дэкрэт парушае ня толькі беларускі Асноўны закон, але й шэраг міжнародных пагадненьняў — Канвэнцыю аб правах дзіцяці, падпісаную ААН, у прыватнасьці. Выклікае пытаньне праваабаронцы і прымусовая праца ненадзейных бацькоў. Па яго словах, міжнародная практыка прадугледжвае такую працу толькі ў якасьці пакараньня за зьдзейсьненае злачынства. У дадзеным выпадку гаворка вядзецца пра людзей, якія, магчыма, ніколі не прыцягваліся да крымінальнай ды адміністратыўнай адказнасьці.

**СП**

# Справа Моніча

Упершыню за мяжою затрыманы беларускі агент.

Польшча зьвярнулася да Літвы з афіцыйнай просьбай аб экстрадыцыі затрыманага на літоўскай тэрыторыі грамадзяніна Беларусі Сяргея Моніча, які падазраецца ў шпіянажы супраць Польшчы.

Польскія ўлады мяркуюць, што працэс экстрадыцыі зойме паўтара месяцы. Галоўны пракурор Польшчы Януш Качмарак заявіў, што затрыманы беларус-«шпіён» «працаваў надзвычай прафэсійна». Яго падазраюць у зборы інфармацыі супраць уплывовых асобаў Польшчы.

Беларускі КДБ пакуль ніяк не камэнтуе гэтай інфармацыі.

Затрыманьне можа пагоршыць і без таго млявыя адносіны між Вільняй, Варшавай ды Менскам.

Польскія актывісты Гарадзеншчыны пабойваюцца, што ахвярнымі казламі ў гэтым канфлікце могуць аказацца яны.

Калі той «Моніч» сапраўды сакрэтны агент, гэты першы супрацоўнік беларускай замежнай выведкі, затрыманы за мяжою пасьля аднаўленьня незалежнасьці.

**Мікола Бугай**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**На фота: свае падарункі Казуліну перадалі калегі з апазыцыі.**

## У Казуліна гусьцее кроў

Экс-кандыдат у прэзыдэнты Беларусі Аляксандар Казулін 41-ы дзень (па стане на сераду) трымае галадоўку ў турме. Намесьнік начальніка дэпартамэнту выкананьня пакараньняў МУС Беларусі Юры Баранкоў заявіў, што «мэдыкі ацэньваюць ягоны стан як сярэдняцяжкі, блізкі да здавальняючага і гатовыя аказаць яму ўвесь комплекс неабходнай мэдычнай дапамогі».За час галадоўкі А.Казулін страціў 20 кг і ў яго назіраюцца характэрныя сымптомы працяглай галадоўкі – загусьценьне крыві і пах ацэтону ад цела». Са словаў міліцыянта, «А.Казулін пагадзіўся з ужываньнем да яго мэтадаў інтэнсіўнай тэрапіі ў выпадку страты прытомнасьці». Апошняя інфармацыя не знайшла пакуль пацьверджаньня зь незалежных крыніцаў.

«На выпадак неабходнасьці ў выпраўленчай калёніі ёсьць глюкоза для ўнутрывеннага ўвядзеньня. бялок. Калі паўстане неабходнасьць, А.Казулін будзе пераведзены ў адну з абласных мэдычных установаў альбо ў турэмную больніцу ў Менску», – цытуе яго словы агенцтва АФН. Ён паінфармаваў, што «А.Казуліну дазволена часьцей за іншых зьняволеных прымаць душ, што ёсьць адным з асноўных правілаў працяглага галаданьня».

У тую суботу былому рэктару БДУ споўніўся 51 год. Адміністрацыя дазволіла яму сустрэцца з жонкай і дачкой, але з умовай угаварыць яго спыніць галадоўку, – расказала жонка Ірына.

У свой дзень народзінаў Казулін пачаставаў сукамэрнікаў «вядром гарбаты» і цукеркамі. Гэты пачастунак спадар Аляксандар купіў у турэмным шапіку.

А яшчэ жонка прывезла яму ваду з гаючай крыніцы, аўсяны кісель, зеляніну і яблыкі. За ваду палітык падзякаваў. але выходзіць з галадоўкі адмовіўся, паведамляе «Камсамолка».

## 86-я гадавіна Слуцкага збройнага чыну



WWW.SVABODA.ORG

У Слуцку ля гістарычнага музэю адбыўся мэмарыяльны мітынг. У 1920 годзе ў будынку засядала Слуцкая Рада, якая прызнала ўладу Беларускай Народнай Рэспублікі, пасьля чаго аддзелы случчакоў уступілі ў барацьбу з Чырвонай Арміяй.

Сёлетні мітынг быў санкцыянаваны ўладамі і самы масавы за апошнія гады. Арганізавалі яго актывісты Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ. Да іх далучылася моладзь з Салігорску й Слуцку — усяго больш як сотня зухаў. Выступоўцы ўспаміналі герояў і гаварылі пра сёньняшнія праблемы: кантрактную сыстэму, схаванае беспрацоўе ды нацыянальную дыскрымінацыю беларусаў.

Паралельна ў Слуцку мэмарыяльную імпрэзу ладзілі сябры незарэгістраванай грамадзкай ініцыятывы «Разам», якія аб’ядналіся ў часе сакавіцкіх пратэстаў.

**ЗП; радыё «Свабода»**

## Зварот ТБМ: Абвесьціць 2007-ы Годам беларускай мовы і культуры

Сакратарыят ТБМ зацьвердзіў зварот да кіраўніка беларускай дзяржавы з прапановай абвесьціць наступны год Годам беларускай мовы і культуры.

У сваім звароце ТБМ нагадвае беларускім уладам, што ў наступным, 2007 г. споўніцца 125 гадоў з дня народзінаў клясыкаў нашай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа.

У сувязі з гэтым ТБМ прапануе выдаць адпаведны Ўказ альбо Пастанову Савету Міністраў, у якіх варта адлюстраваць наступнае: абвесьціць 2007 г. годам беларускай мовы і літаратуры; вярнуць у адукацыйныя стандарты для ВНУ абавязковае выкладаньне беларускай мовы і курсу «Беларусазнаўства»; аднавіць выкладаньне гісторыі і геаграфіі Беларусі ў школах з расейскай мовай навучаньня на дзяржаўнай беларускай мове; адкрыць у Менску Нацыянальны ўнівэрсытэт з выкладаньнем усіх прадметаў па–беларуску і надаць яму імя Якуба Коласа.

# Ксёндз Шэмет: «Дзякуй пратэстантам, што яны далі нам мужнасьці»

Сьледам за пратэстантамі галадоўку распачынаюць каталікі.

Яшчэ адна рэлігійная парафія абвесьціла, што бліжэйшым часам распачне галадоўку-пост. Сьледам за вернікамі зь менскай пратэстанцкай царквы «Новае жыцьцё» пра такую акцыю пратэсту заявіў пробашч каталіцкай парафіі Найсьвяцейшай Панны Марыі, Маці міласэрнасьці Аляксандар Шэмет (**на фота**).

У пятніцу 24 лістапада з раніцы група вернікаў, якая налічвала больш за сто чалавек, накіравалася ў Гарадзенскі аблвыканкам. Вось ужо дзесяць гадоў гарадзкія ўлады не даюць дазволу на будаўніцтва касьцёлу.

Пра сваю акцыю каталікі заявілі яшчэ ў панядзелак, таму іх ужо чакаў старшыня гарадзенскага аблвыканкаму Ўладзімер Саўчанка і прадстаўнікі мясцовых уладаў.

Паводле словаў айца Аляксандра Шэмета, Саўчанка заявіў, што некаторыя вернікі абкрадаюць касьцёлы, і таму іх будаўніцтва ідзе так марудна. «Гэта адкрытае абвінавачаньне ў тым, што мы махляры і злодзеі, — кажа Аляксандар Шэмет. — Пасьля Саўчанка пачаў гаварыць пра тое, што вы ж самі ведаеце, што некаторыя каталіцкія сьвятары нагнятаюць палітычную сытуацыю ў краіне. Я вельмі шкадую, што ня ўзяў дыктафона, каб запісаць гэтыя выказваньні чыноўніка. Але гэта чулі людзі, якія прыйшлі разам са мной. Пасьля такіх словаў я не пачаў спрачацца, а проста прапанаваў усім вернікам сысьці з будынку. Тады Саўчанка пачаў у нашыя сьпіны крычэць, што дазваляе будаўніцтва храму. Людзі ўзрадаваліся, пачуўшы такія словы, але я сказаў, што словы застаюцца толькі словамі, а нам патрэбен пісьмовы дазвол».

У радзе ў справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Гарадзенскага аблвыканкаму кажуць, што гэта была сплянаваная правакацыя а.Аляксандра Шэмета, які «ня ёсьць такім ужо руплівым за рэлігію і людзей, якім хоча падацца. Гэты чалавек у свой час быў двойчы пакараны штрафам за тое, што незаконна зачыніў брамы на могілках у вёсцы Адамовічы і не дазволіў тамака хаваць чалавека, а пазьней за тое, што парушыў правілы знаходжаньня на тэрыторыі Беларусі замежнага сьвятара», — сказаў супрацоўнік рады Мікалай Пацярухін.

Сам айцец Аляксандар кажа, што ў той дзень, калі зачынілі могілкавыя брамы, ён увогуле адсутнічаў у Адамовічах. Шэмет не адмаўляе, што да яго ў госьці насамрэч прыяжджаў ксёндз з Польшчы Юзаф Грэцкі, але адмаўляецца прызнаць сваю віну. «Мяне сапраўды пакаралі штрафам, у мяне быў выбар, каб яго не плаціць, але я заплаціў, сказаўшы, што гэта пойдзе тым, хто мяне пакараў, на лекі», — сказаў кс.Аляксандар.

Зрэшты, якое дачыненьне гэта мае да будаўніцтва храму? Але такім чынам Гарадзенскі аблвыканкам спрабуе апраўдаць тое, што на працягу дзесяці гадоў не дае дазволу на будаўніцтва.

Прадстаўнік гарадзенскай курыі ксёндз-канцлер Антоні Ханька камэнтаваць падзеі адмовіўся: «Я яшчэ да канца не разабраўся ў гэтай сытуацыі, бо ў час, калі сваю акцыю праводзіў Аляксандар Шэмет, адсутнічаў у Горадні, таму пакуль не сьпяшаюся даваць ніякіх камэнтароў».

Ксёндз Шэмет не ўважае галадоўку-пост за крайнюю форму пратэсту. Ён кажа, што цяпер гэта ледзьве не адзіная акцыя, якая можа займець грамадзкі розгалас. «Гэта наш своеасаблівы крык душы», — кажа сьвятар. Разам з ксяндзом Аляксандрам Шэметам 1 сьнежня галадоўку-пост маюць пачаць яшчэ некалькі дзясяткаў вернікаў. Яны галадацьмуць у будынку парафіяльнай капліцы.

Паводле словаў А.Шэмета, раней парафіянам не хацелася выносіць сьмецьця з хаты, але цяпер гэта стала неабходнасьцю.

Айцец Шэмет кажа, што на галадоўку-пост іх натхніла падобная акцыя менскіх пратэстантаў. «Дзякуй пратэстантам, што яны далі нам мужнасьці, мы штодня падчас іхняй акцыі пратэсту маліліся за галадоўнікаў».

Пра гарадзенскую акцыю пратэсту вернікаў не паведамілі дзяржаўныя СМІ. Маўчыць пра гэтыя падзеі і галоўны каталіцкі партал Беларусі www.catholic.by.

Тым часам Аляксандар Шэмет у аўторак пацьвердзіў, што не зьбіраецца адмаўляцца ад галадоўкі. «А што нам яшчэ застаецца? — пытаецца ён. — Гарадзкія ўлады думалі, што мы крыху папратэстуем і супакоімся, але, як казаў Ісус Хрыстос, супакою ня будзе ніколі. Мы пойдзем да апошняга, пакуль маем сілы нешта яшчэ зрабіць».

Ня так даўно галадалі вернікі-пратэстанты, цяпер чарга за каталікамі. Працягваецца барацьба актывістаў непрызнанага ўладамі Саюзу палякаў на чале з Анжалікай Борыс. Прапагандысцкі штамп уладаў, што ў Беларусі пераадоленыя ўсе сацыяльныя, рэлігійныя і нацыянальныя канфлікты, выглядае цяпер не зусім адпаведным .

**Зьміцер Панкавец**

# «Галадоўка

Што думаюць пра галадоўку-пост сьвятара Аляксандра Шэмета і ягоных парафіянаў каталіцкія, пратэстанцкія і ўніяцкія сьвятары, каталіцкія інтэлектуалы і інтэлігенцыя?

**Ксёндз Дзьмітры Барыла, Ракаў**: «На маю думку, такія акцыі, якую мае распачаць Аляксандар Шэмет, мусяць праходзіць толькі з дазволу біскупа, посьпех гэтай галадоўкі-посту і будзе ў першую чаргу залежаць ад таго, ці падтрымае яе вярхоўнае каталіцкае духавенства. Што да мяне, то я лічу, што галадоўка — гэта не зусім тая форма барацьбы, дзякуючы якой у нашай краіне можна чагось дамагчыся. Як падаецца мне, то найбольш дзейснымі былі б малітоўныя акцыі. Трэба маліцца, каб паказаць гэтую несправядлівасьць. Малітоўныя акцыі мусяць быць ня толькі ў Горадні, але і па ўсёй Беларусі».

**Ксёндз Вячаслаў Барок, Расоны**: «Я добра ведаю, што такое ў нашай краіне атрымаць дазвол на пабудову храму, бо сам пяць гадоў дамагаўся гэтага ў Расонах. Таму я разумею а.Аляк-




# як прыкмета часу»

сандра. Калі ў яго няма іншага выйсьця, то я цалкам падтрымліваю яго. Абяцаю, што з майго боку будзе аказана малітоўная падтрымка. Веру ў тое, што гэты гарадзенскі пост дасьць плён і гарадзкія ўлады ўрэшце дадуць дазвол на пабудову касьцёлу. Таму заахвочваю гарадзенскіх парафіянаў падтрымаць у гэтай галадоўцы-посьце свайго пробашча. На мой погляд, і такая форма пратэсту мае права на жыцьцё».

**Ірына Жарнасек, пісьменьніца**: «Некалі ў «Прыватным дзёньніку» для радыё «Свабода» я пісала, што галадоўка цяпер — гэта своеасаблівая прыкмета часу. Страшная, хачу адзначыць, прыкмета. Людзі ня маюць іншага мэтаду, каб іх пачулі, скажам, праз газэту ці вуліцу, таму застаюцца адны галадоўкі. Я захапляюся гэтым мужным крокам, на які гатовы ісьці айцец Шэмет, ён хоча, каб ягоны голас пачулі. Не бяруся пакуль прадказваць, чым можа скончыцца і які вынік мець гэтая галадоўка-пост».

**Пётра Рудкоўскі, манах-дамініканец, філёзаф**: «Гэта досыць цікавы выпадак, бо ўпершыню ў гісторыі Беларускага Касьцёлу нехта са сьвятароў наважваецца на такі неардынарны крок. Гэта прэцэдэнт, які ўражвае сваёй адвагай. Пратэстны крок Аляксандра Шэмета, пэўна, мае сур'ёзныя падставы. Калі сьвятар гатовы ісьці на такое, то відавочна, што ён мае справу з пэўнай несправядлівасьцю. Нешта сапраўды ня так, калі вернікі адважыліся на галадоўку-пост. Ня думаю, што ўчынак Шэмета ідзе ўразрэз з пазыцыяй гарадзенскага біскупа, аднак мяркую, што ён мог не чакаць такога спрыту ад сьвятара і цяпер знаходзіцца ў пэўнай разгубленасьці. На 60—70% я ўпэўнены, што галадоўка-пост мусіць прынесьці посьпех. Што будзе далей, я не бяруся казаць».

**Ксёндз Крыштаф Мікалайчык, Глыбокае**: «Калі сьвятар хоча пайсьці на такі крок, то ён мае на гэта права. Ці дасьць гэтая галадоўка-пост нейкі плён — тут усё залежыць ад волі Божай».

**Міхаіл Ермашкевіч, манах-дамініканец**: «Бываюць такія выпадкі, калі іншых шляхоў для вырашэньня справы няма, тады варта ісьці на такі крок. У Бога ўсё магчыма, таму пры згодзе і салідарнасьці вернікаў галадоўка-пост а.Аляксандра Шэмета можа быць пасьпяховая».

**Айцец Андрэй Сідаровіч, Расіца**: «Галадоўка вернікаў царквы «Новае жыцьцё» ў Менску даказала, што і такім спосабам можна дамагацца, каб паважаліся правы вернікаў. Таму я лічу такі сродак жыцьцяздольным. Патрэбная толькі вялікая салідарнасьць усіх нас, каб дамагчыся мэты, бо кожнаму асобна зрабіць нешта будзе вельмі цяжка».

**Вячаслаў Ганчарэнка, пастар менскай пратэстанцкай царквы «Новае жыцьцё»**: «Тое, што галадоўкі-пасты пачынаюць пашырацца сярод вернікаў, сьведчыць пра шматгадовы канфлікт між уладамі і рэлігійнымі суполкамі, які найперш ляжыць у Законе аб свабодзе сумленьня. Сёньня насьпеў час унесьці зьмену ў той Закон. Посьпех галадоўкі каталікоў будзе залежыць ад таго, наколькі адзінай будзе афіцыйная пазыцыя Касьцёлу, а таксама наколькі пра гэты крок адчаю стане вядома ў краіне і ў сьвеце. Наша царква накіруе ліст падтрымкі айцу Аляксандру і ягоным парафіянам».

**Апытаў Зьміцер Панкавец**

# Гонка з выбываньнем

Ці нясуць спартоўцы адказнасьць за сыстэму? Нясуць, — піша **Віталь Тарас** з нагоды нявыдачы візаў беларускім футбалістам.

Апошнія прапановы Эўразьвязу да Беларусі выклікалі моцны розгалас у беларускіх мэдыях. Але працягвалася гэта нядоўга. Як гэта часта бывае, апошнія падзеі засланяюць сабой папярэднія — нават калі папярэднія — больш значныя й знакавыя. Праз некалькі дзён пасьля прэзэнтацыі дакумэнту ў Брусэлі й Менску ў сталіцы Беларусі адбылася прэсавая канфэрэнцыя Аляксандра Лукашэнкі для ўкраінскіх журналістаў. Асобныя выказваньні кіраўніка дзяржавы на ёй падаліся журналістам настолькі сэнсацыйнымі, што ўвага мэдыяў, прытым ня толькі дзяржаўных, адразу пераключылася на новую тэму. Асаблівы ажыятаж выклікала заява, што вынікі прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі былі скарэктаваныя загадам зьверху. Можна падумаць, быццам да гэтай заявы ў кагосьці яшчэ заставаліся сумненьні, што вынікі выбараў былі прадвызначаныя, а роля Цэнтравыбаркаму зводзілася да выкананьня загадаў.

Акрамя таго, шмат камэнтароў было прысьвечана прапановам Лукашэнкі стварыць з Украінай саюз у процівагу «вялікай энэргетычнай дзяржаве». Такім чынам, напярэдадні саміту СНД кіраўніцтву Беларусі ўдалося лёгка адцягнуць увагу ад прапановаў Эўразьвязу і тае альтэрнатывы, якая сапраўды дае магчымасьць Беларусі не залежаць ад любові ці нелюбові Крамля.

## О спорт! Ты...

У тыя ж дні здарыўся эпізод, які хоць і застаўся на пэрыфэрыі ўвагі незалежнай прэсы, але выглядаў вельмі сымптаматычным. Француская пасольства адмовіла выдаць шэнгенскія візы гульцам зборнай Беларусі па футзале, якія зьбіраліся ехаць на Чэмпіянат Эўропы ў Гішпанію. Адначасна праз адмову ў візах не змаглі паехаць на міжнародны матч беларускія більярдысты. Футзал, у адрозьненьне ад футболу, ня самы папулярны від спорту. Більярд жа можа некаму падасца ўвогуле экзатычным, несур'ёзным заняткам. Але трэнэры, сябры зборнай па футзале і галоўнае — спартовыя чыноўнікі, за нэрвовай рэакцыяй якіх можна было назіраць у рэпартажах беларускіх тэлеканалаў, лічаць свой занятак вельмі важным. І яны не памыляюцца.

Інакш, калі б спорт мала што значыў для сёньняшняй дзяржавы, яе кіраўнік не ўзначальваў бы Нацыянальнага алімпійскага камітэту, а кіраўнікі сілавых міністэрстваў не кіравалі б адначасова рознага роду спартовымі фэдэрацыямі. Цяжка, зразумела, гаварыць аб пасьлядоўнай палітыцы санкцыяў з боку Эўразьвязу на падставе ўсяго аднаго-двух эпізодаў. Але цяжка таксама дапусьціць, што рашэньне аб адмове ў візах чыста выпадкова супала з вылучэньнем дванаццаці ўмоваў ЭЗ у справе дэмакратызацыі Беларусі.

Кіраўніцтва Эўразьвязу і раней давала зразумець, што яно будзе пазьбягаць эканамічных санкцыяў (такіх, якія ўжывае, скажам, Расея супраць Грузіі). Бо ад іх, натуральна, будуць найбольш цярпець ня столькі дзяржаўныя чыноўнікі, колькі простыя грамадзяне. Гісторыя паказвае, што эканамічныя санкцыі і цяжкасьці, імі выкліканыя, здольныя толькі яшчэ больш згуртаваць народ вакол сваіх лідэраў.

Варта згадаць хаця б славутае «Бостанскае чаяваньне», зь якога пачалася вайна за незалежнасьць у Паўночнай Амэрыцы. Заўважце, не праз цэны на паліва ці пшаніцу, а ўсяго толькі ад падвышэньня падатку на каляніяльны тавар Лёнданам у Паўночна-Амэрыканскіх штатах выбухнула буржуазная рэвалюцыя.

А вось што тычыцца спорту — тут санкцыі закранаюць ня столькі эканамічны ці палітычны бок справы, колькі маральныя струны грамадзтва. Гульня на патрыятычных струнах можа адгукнуцца куды больш балюча, чым забарона на ўезд у ЭЗ якога-небудзь старышні тэлерадыёкампаніі. Якую б чорную рэпутацыю ня меў дзяржаўны чыноўнік, такая забарона тычыцца найперш яго асабіста і ягонай сям'і. Пакуль такая забарона ня стала ўсеагульнай, астатнія чыноўнікі будуць толькі радавацца «чужому гору». Бо ў сыстэме кіраваньня, перанятай у спадчыну ад Савецкага Саюзу, незаменных, як вядома, няма.

## Каму санкцыі не да лямпачкі?

Звычайныя грамадзяне, у масе сваёй пазбаўленыя інфармацыі, ніколі не даведаюцца аб «пунктавых санкцыях» супраць асобна ўзятых чыноўнікаў. А вось калі санкцыі закрануць папулярныя віды спорту, пра гэта вельмі хутка даведаецца ўся краіна. Здавалася б, у гэтым выпадку ўсе сымпатыі будуць на баку «няшчасных спартоўцаў», а дзеяньні Захаду — выклікаць адно толькі злосьць і нянавісьць да «крыўдзіцеляў». Але нішто іншае як санкцыі ў галіне спорту здольныя паказаць узровень маральнай ацэнкі таго або іншага рэжыму ў цывілізаваным сьвеце.

Байкот маскоўскае Алімпіяды, выкліканы ўварваньнем СССР у Аўганістан, вельмі балюча ўспрымаўся і на ўзроўні палітбюро ЦК КПСС, і на ўзроўні масавай сьвядомасьці. Я памятаю, як многія мае сябры ў 1980-м востра перажывалі адсутнасьць на Алімпійскіх гульнях спартоўцаў ЗША і Заходняй Эўропы. (Хоць некаторыя алімпійскія дэлегацыі абышлі тады байкот. Як яны радаваліся, калі нехта з заходніх спартоўцаў выходзіў на рынг, нават — калі некаму зь іх удавалася выйграць мэдаль! Чаму? Ды таму, што сапраўдны заўзятар разумее: усе ўзнагароды абясцэньваюцца, калі няма сапраўднае барацьбы, няма сапраўдных спаборнікаў.)

Савецкі байкот у адказ — супраць Алімпіяды ў Лос-Анджэлесе ў 1984-м годзе, якую нават не паказвалі (беспрэцэдэнтны выпадак!) у СССР, выклікаў сярод савецкіх заўзятараў усеагульную апатыю, panыласьць і расчараваньне. Праўда, масавых пратэстаў з гэтай нагоды тады не было. Але ўсяго цераз год Гарбачоў загаварыў аб вывадзе савецкіх войскаў з Аўганістану. Зразумела, не байкот Алімпійскіх гульняў стаўся прычынаю паразы ў Аўганістане і распаду СССР. Але савецкія людзі, якія моўчкі згаджаліся з тым, што тысячы іх суайчыньнікаў гінуць, выконваючы «інтэрнацыянальны абавязак», змаглі выразна адчуць у сярэдзіне 80-х моц маральных санкцыяў, свайго роду маральны астракізм цывілізаванага сьвету на сабе. Ім адмаўлялі ў праве прысутнічаць на «сьвяце жыцьця». Самыя цікавыя відовішчы й

спаборніцтвы былі не для іх.

Пры канцы тых самых 80-х у краінах Брытанскай Судружнасьці доўга разважалі: ці байкатаваць зборную па рэгбі і хакеі на траве з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі? Ці нясуць белыя спартоўцы адказнасьць за сыстэму апартэіду, якая не давала чорным спартоўцам права выступаць у адной камандзе зь белымі? Урэшце, спартовая грамадзкасьць вырашыла: маральную адказнасьць нясуць. Гуляць з камандай краіны, дзе груба парушаюцца правы чалавека, — значыць ускосна падтрымліваць рэжым.

## Браты па «сувэрэннай дэмакратыі»

Байкатаваньне спартовых кантактаў — хаця б у выглядзе адмовы спартоўцам у візах — не прыносіць эканамічнай шкоды. Яно ставіць пытаньне аб маральнай адказнасьці. Хочаце гуляць з эўрапейцамі, мець такія ж выгоды, як эўрапейцы, — дакажыце, што вы здольныя гуляць паводле эўрапейскіх правілаў. І ня толькі ў спорце.

Так ужо супала, што галоўны ўдар па міжнароднай рэпутацыі Расеі ў гэтыя дні нанесьлі ёй не крытычныя выпады хаўрусьніка зь Менску, да абвінавачаньняў якога ў здрадзе савецкім ідэалам даўно прызвычаіліся, а былы супрацоўнік ФСБ палкоўнік Літвіненка, які перад самай сьмерцю абвінавáціў у сваім атручаньні Пуціна. Усё савецкае мінулае ва ўсім сваім жахлівым убостве, улучна з палітычнымі забойствамі, чаго так доўга і ўпарта не хацелі заўважаць на Захадзе, раптам паўстала перад ім.

Адной з ахвяраў спэцапэрацыяў КГБ стаў у свой час Бандэра, які змагаўся ў гады Другой сусьветнай вайны як з гітлераўцамі, гэтак і з «савецкімі вызваліцелямі». Цяпер ва Ўкраіне хочуць аднавіць гістарычную справядлівасьць, ушанаваўшы памяць бандэраўцаў. Адным з ініцыятараў гэтага выступае і прэзыдэнт Ющчанка. Ён пасьлядоўна выступае таксама за прызнаньне на заканадаўчым узроўні галадамору 1932—1933 гадоў (у выніку яго загінула некалькі мільёнаў чалавек) актам генацыду. Не генацыдам з боку расейскага народу, але актам савецкага, сталінскага генацыду.

Зразумела, пра гэта ня будзе гаворкі падчас саміту кіраўнікоў дзяржаваў СНД у Менску. Там будуць гаварыць, як заўсёды, пра эканоміку і карысьць інтэграцыі, пра культурніцкія, спартовыя ды іншыя сувязі. Але насамрэч прычына карэнных разыходжаньняў паміж такімі краінамі, як Грузія, Малдова, Украіна і ўсімі астатнімі, у іхным ліку і Беларусь, палягае цяпер менавіта ў розным стаўленьні да гістарычнага мінулага — у гатовасьці ці негатовасьці нацыяў адрынуць спадчыну сталінізму, назаўсёды асудзіць сталінскую эпоху зь яе масавымі рэпрэсіямі супраць мільёнаў людзей і цэлых народаў.

Гэта ёсьць таксама галоўнай, хоць і не названай у дакумэнце ЭЗ, умовай уваходжаньня Беларусі ў эўрапейскую супольнасьць з усімі яе прэфэрэнцыямі. А пакуль розьніца паміж паноўнымі рэжымамі ў Беларусі і Расеі застаецца невялікай. Паводле Індэксу дэмакратыі за 2006 год, Расея займае 102-е месца. Беларусь — 128-е. Праўда, Беларусь фігуруе ў разьдзеле аўтарытарных рэжымаў, а Расея — «гібрыдных». (Ці, як кажуць у самой Расеі, — «сувэрэннай дэмакратыі».) Украіна тым часам перайшла ў разьдзел краінаў, якія пераходзяць да дэмакратыі. Так што поле для спаборніцтва ў Беларусі пакуль ёсьць. І палягае яно ня толькі ў галіне спорту.



## Пад Сівакова ўзяліся капáць

23 лістапада спэцпадразьдзяленьне КДБ «Альфа» затрымала некалькі дзясяткаў чалавек, якія ўваходзілі ў асацыяцыю вэтэранаў спэцназу «Гонар», якую ўзначальвае Юры Сівакоў.

Гаворка вядзецца пра спробы выявіць арганізаваную злачынную групу, якая займалася кантрабанднымі пастаўкамі мяса з Польшчы праз Беларусь у Расею. У рамках крымінальнай справы на гэтую групу ўчынілі, піша сайт «Беларускі партызан»ператрусы ў офісе Асацыяцыі вэтэранаў падразьдзяленьняў спэцыяльнага прызначэньня войскаў МУС «Гонар», цягам якіх знайшлі 430 тыс. даляраў ЗША. Сьледчыя органы арыштавалі рахунак Асацыяцыі, на якім мелася блізка 1 900 000 000 рублёў.

**Водгук на сайце nn.by**
Сведка напісаў(ла) Лістапад 24, 2006 у 13:48
Затрыманьне бачыла на ўласныя вочы, бо офіс гэтак званай асацыяцыі знаходзіцца побач зь месцам працы. Самае цікавае, што празь літаральна 10 хвілін пасьля таго, як ад'ехаў аўтобус з «Альфай», прыляцеў такі ж аўтобус са спэцназам МУС (вызваляць, мабыць). Але крыху спазьніліся...

## На Маладачаншчыне грузавік задушыў тры жанчыны

У вёсцы Цюрлі загінулі тры жанчыны. Яны сталі ахвярай грузавіка. Як сьведчаць міліцыянты, 26-гадовы шафёр ня даў рады кіраваньню «МАЗу-5551». Вылецеў на ўзбочыну дарогі, а там якраз чакалі аўтобуса тры кабеткі. Малодшай зь іх 54 гады, найстарэйшай — 61. Пасьля аўтамабіль зьехаў у кювет і перакуліўся. Кіроўца, зьнявечаны, трапіў у больніцу.

**Паводле «Эўрапейскага радыё для Беларусі»**

## Беларусь хоча арандаваць ва Ўкраіны энэргаблёкі АЭС

Такую заяву зрабіў у Кіеве беларускі віцэ-прэм'ер Уладзімер Сямашка. Паводле ягоных словаў, Беларусь зацікаўленая ў новых крыніцах энэргіі праз падвышэньне цаны на расейскі газ з студзеня наступнага году. «Мы, напэўна, будзем ставіць пытаньне... каб узяць хаця б адзін з блёкаў АЭС у арэнду».

**Паводле «5-ы канал»**

## Гарадзенцы ўшанавалі памяць Фары Вітаўта

Неабыякавыя гарадзенцы памятаюць пра зруйнаваны камуністычнымі ўладамі 29 лістапада 1961 году старажытны касьцёл — знакамітую Фару Вітаўта. З нагоды 45-х угодкаў зьнішчэньня бажніцы ў мясцовай катэдры прайшло ўрачыстае набажэнства.

Напярэдадні энтузіясты выпусьцілі паштоўку з выявай храму пад назвай «45 гадоў бяз Фары Вітаўта».

Фару Вітаўта збудавалі пры канцы XIV ст. пры Вітаўту Вялікім, таму за ёй замацавалася ягонае імя. У XVI ст. побач з драўлянай пабудовай кароль Сьцяпан Батура збудаваў мураваны храм, які пераняў назву папярэдніка.

**Сямён Печанко**



## На помніку Караткевічу зьявіўся бел-чырвона-белы сьцяг

У нядзелю раніцай да п'едэсталу помніка Караткевічу ў Віцебску прымацавалі бел-чырвона-белы сьцяг. Сам помнік упрыгожылі гвазьдзікі, абгорнутыя бел-чырвона-белай стужкай. Гэтак сябры віцебскай арганізацыі Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ ушанавалі памяць пісьменьніка, дзень нараджэньня якога адзначаўся 26 лістапада.

Прыкладна праз гадзіну сьцяг і кветкі зьнялі міліцыянты Кастрычніцкага РУУС. У падножжы сталі і кветкі ад сяброў прадзяржаўнага Саюзу пісьменьнікаў Беларусі. Пра тое сьведчыла шыльдачка зь віншавальным надпісам і подпісам. Міліцыянтам было ўсё роўна: разам са сьцягам КХП-БНФ яны прыбралі і таблічку «правільных» пісьменьнікаў.

**«Народныя навіны Віцебску»**

## Зьнялі бесправадны тралейбус, затое пусьцілі аўтобус-аўдыторыю

Першы на прасторы былога СССР рэгулярны тралейбусны маршрут, які часткова праходзіў па вуліцы без кантактнай сеткі, пратрымаўся тыдзень. Тралейбус маркі АКСМ-33300А быў перакінуты на звычайны маршрут Бабруйску №2. Прычына — малая колькасьць пасажыраў.

Затое ў Бабруйску абкатваецца новая навінка — аўтобус-аўдыторыя, у якім пешаходы-парушальнікі правілаў дарожнага руху маюць магчымасьць ня толькі пакатацца па родным горадзе, але і паслухаць лекцыі даішнікаў, дый на разьвітаньне атрымаць флікер — адлюстравальны значок, каб быць больш прыметным на дарозе.

У тым ёсьць свой разьлік — гэткая лекцыя вызваляе ад штрафу, які сёньня складае 15500 рублёў.

**Паводле «Вечерний Бобруйск»**

## Міліцыя з камэрамі БТ сарвала гендэрны сэмінар

У Магілёве затрымалі замежнікаў, што ўдзельнічалі ў сэмінары. Прадстаўнікі Украіны, Літвы, Швэцыі абмяркоўвалі праблемы гендэрнага балянсу. Нечакана на сэмінар наведалася

здымачная група БТ, а потым міліцыянты ў цывільным. У Ленінскім РУУС Магілёва замежнікі прабылі больш за дзьве гадзіны. Арганізатарку групы, грамадзянку Швэцыі Марыю Свэнсан, аштрафавалі на 10 мінімалак.

З астатнімі пяцьцю замежнікамі міліцыянты правялі прафіляктычную гутарку і адпусьцілі. Сэмінар сарваны, уражаньняў мора.

**Паводле радыё «Свабода»**

## Навукоўцы распрацавалі сродак барацьбы з цэнзурай у Сеціве

Дасьледчыкі з унівэрсытэту Таронта прэзэнтавалі незвычайны праграмны комплекс «Psiphon», які, паводле слоў распрацоўшчыкаў, здольны пераадольваць розныя дзяржаўныя мэтады цэнзураваньня ў Інтэрнэце.

Новая праграма дазволіць грамадзянам краін, у якіх абмяжоўваецца свабода, атрымаць доступ да забароненых інтэрнэт-рэсурсаў зь любога пункту. Праграма надзейна абароненая ад электроннага праслухоўваньня. Тэставаньне ідзе зь лета, фінальная вэрсія зьявіцца 1 сьнежня 2006 г.

Нядаўна міжнародная арганізацыя «Рэпартэры бязь межаў» склала сьпіс з 13 краінаў — «ворагаў Інтэрнэту». У гэты сьпіс трапілі Беларусь, Кітай, Паўночная Карэя ды іншыя дзяржавы.

**Паводле «Эўрапейскага радыё для Беларусі»**

## «Залаты мяч» атрымаў Бэрлінскі мур

Паводле вынікаў традыцыйнага апытаньня французскага часопісу «France football» гульцом году ў Эўропе прызнаны італьянскі абаронца мадрыдзкага «Рэалу» Фаб'ё Канавара. Ён апярэдзіў у апытаньні яшчэ аднаго італьянца, брамніка Джанлюіджы Буфона і францускага нападніка Т'еры Анры. Апошнім разам італьянец атрымліваў «Залаты мяч» у 1993 г. — тады ўладальнікам стаў Рабэрта Баджа.



Перамога Канавара не выглядае сэнсацыйнай. Зборная Італія, якую выводзіў на поле з капітанскай павязкай Фабіё Канавара, сёлета перамагла на мундыялі ў Нямеччыне. Канавара цэмэнтаваў італьянскую абарону, якую прызналі самай надзейнай на чэмпіянаце.

Канавара 33 гады. Ён нарадзіўся ў Нэапалі, там жа пачаў кар'еру. Пасьля былі «Парма», «Інтэр», «Ювэнтус». Сёлета пасьля карупцыйнага скандалу на Апэнінах Канавара перабраўся ў мадрыдзкі «Рэал».

За «Напалі» цяпер гуляе ягоны брат Паўла.

Для прэсы Канавара — сэкс-сымбаль. Ён мае тысячы прыхільніцаў, але дружна жыве з жонкай Даніэлай. Мае траіх дзяцей, двух сыноў і дачку (**на фота**). Старэйшы сын Крысьціян, ужо вырашыў, што, як тата, хоча стаць футбалістам.

**Зьміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Цырымонія перазахаваньня парэштакаў Напалеонавых жаўнераў на Брылеўскім полі, ля старой пераправы празь Бярэзіну. 26 лістапада, 194-я гадавіна пераходу Вялікай арміі празь Бярэзіну, 208-я – з дня нараджэньня Адама Міцкевіча.**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Знайсьці мужыка

У Малым Сітне асабліва ясна разумееш, чаму Лукашэнка просіць падтрымкі *ў жэншчын*.

Справа ня ў тым, што жанчыны складаюць большасьць насельніцтва Беларусі. І нават ня ў тым, што ў асноўным яны галасуюць за таго, паводле вызначэньня папулярнай савецкай песенькі, *сапраўднага мужчыну*, які гуляе ў хакей. Рэч у тым, што ўласна мужчыны ў нас у краіне — ужо даўно вялізны дэфіцыт.

Здавалася б, дзе яшчэ шукаць у Беларусі «мужоў моцных», як не на радзіме Ўсяслава Чарадзея, Андрэя Полацкага й Францыска Скарыны, у вёсцы, лясным ды азёрным краі паляўнічых, рыбаловаў і змагароў за волю? Калі ўжо ня рыцараў ці джэнтэльмэнаў — дык хаця б проста нармалёвых мужыкоў?

Але на сіценскіх мужыкоў глядзець шкада. Што й казаць, калі нават у поўных сем'ях тут жонка піша заяву на аліменты, каб спагнаць з мужавага заробку з дапамогай участковага прынамсі нейкую суму?.. Калі ісьці на выбары супраць старшыні сельсавету ў Сітне (дарэчы, таксама жанчыны) пагадзіліся адны жанчыны? Калі з п'янкамі, злоўжываньнямі й крадзяжом лесу ў прамгасе змагаецца хіба што выпускніца вучэльні майстрыца Вікторыя Віктараўна (мужчыны з такой працы проста зьбягаюць)? Калі нават у ТБМ ды «МФ» тут запісваюцца дзяўчаты, а хлопцы сарамліва аднекваюцца: «Я ў палітыку ня лезу»?

Пэўна, толькі гены Эўфрасіньні ды Зінаіды Тусналобавай-Марчанкі, што ў апошнюю вайну вынесла з поля бою сотні параненых, а сама засталася бяз рук і ног, ратуюць Полаччыну... Ды ці яе адну? «Грубая мужчынская праўда» заключаецца ў тым, што жанчыны вымушаныя працаваць на эстакадзе, узворваць палеткі, калоць дровы, браць на сябе ўсю адказнасьць за сям'ю й лёс цэлых вёсак. І, як той казаў, ані табе сьлёз, ані сантымэнтаў.

## ХРОНІКА

**Справа Казуліна**

22 лістапада да галадоўкі салідарнасьці з Аляксандрам Казуліным далучыліся Тацяна Ваніна, лідэр АГП **Анатоль Лябедзька** і намесьнік старшыні БСДП(Г) **Анатоль Ляўковіч**.

**19 лістапада**

Актывіст Саюзу палякаў у Беларусі **Станіслаў Пачобут** трапіў з-за кратаў у шпіталь на абсьледаваньне. 23 лістапада яго вярнулі ў турму — адбываць 2 сутак арышту.

**21 лістапада**

Дырэкцыя гомельскага аўтобуснага парку № 1 паведаміла, што з 1 сьнежня не падаўжае кантракту з актывістамі прафсаюзу РЭП **Андрэем Баранавым**, **Іванам Маскаленкам** і **Аляксандрам Купцовым**.

Берасьцейскі абласны суд другі раз за паўгодзьдзе адмяніў рашэньне суду гораду Пінску і Пінскага раёну па накладаньні штрафу на актывіста ПБНФ **Аляксандра Аўсеенку**, абвінавачанага ў правозе незадэкляраванага тавару — налепак і выбарчых улётак. Абодва суды ладзіліся без удзелу абвінавачанага.

Берасьцейскі абласны суд адхіліў скаргу абласной ДАІ на **Юрася Губарэвіча**: 17 сакавіка аўтамабіль актывіста ПБНФ затрымалі на станцыі тэхагляду.

**22 лістапада**

У Барысаве падчас збору подпісаў пад Пасланьнем Свабоды затрыманы праваабаронца **Алесь Абрамовіч**. 25 лістапада яго затрымалі падчас візыту сваякоў і палітактывістаў да калёніі «Віцьба-3», дзе трымаюць А.Казуліна. 27 лістапада А.Абрамовіча асудзілі на 15 сутак за арганізацыю несанкцыяванага масавага мерапрыемства.

Стала вядома, што ў гарадзенскіх унівэрсытэтах блякуецца доступ да шэрагу Інтэрнэт-сайтаў, у прыватнасьці — да гарадзкога форуму forum.grodno.net і Livejournal.

Прыйшлі зьвесткі пра звальненьні з палітычных прычынаў пакавальшчыка ААТ «Скарыніна» **Максіма Плешчыка** і **Максіма Залескага** зь фірмы «Плянэта гульняў». Сьлесара Менскага аўтазаводу **Аляксандра Дульчыка** начальства папярэдзіла, каб не балятаваўся ў дэпутаты, прыгразіўшы звальненьнем. Студэнту БДУІР Сяргею К. прыгразілі адлічэньнем, калі ня спыніць збор подпісаў.

У Менску падчас збору подпісаў затрымалі **Лідзію Сітаву**, якая раздавала менчукам газэту «Глоток воздуха».

Адзін з стваральнікаў палітычных флэшмультоў **Павал Марозаў** папрасіў палітычнага прытулку ў Эстоніі.

Камітэт ААН у правах чалавека прызнаў незаконнасьць ліквідацыі **ГА «Грамадзянскія ініцыятывы»**, забавязаў беларускія ўлады аднавіць аб'яднаньне й выплаціць яму кампэнсацыю.

**23 лістапада**

На допыт у справе «перавозкі наркотыкаў» выклікалі актывістку Саюзу палякаў у Беларусі **Тэрэсу Селівончык**.

Міліцыя Партызанскага раёну Менску адмовілася распачаць крымінальную справу з нагоды апаганьваньня будынку **Ізраільскага інфармацыйна-культурнага цэнтру**, бо не заўважыла ў гэтым распальваньня міжнацыянальнай варожасьці (на будынку была намаляваная свастыкі й надпісы па-расейску «Бі жыдоў!»).

Падчас расклейкі налепак у Менску затрымалі моладзевых актывістаў **Аляксея Шыдлоўскага** і **Васіля Жакава**.

У Горках з працы ў газэце «Региональные ведомости» звольнілі журналіста **Эдуарда Брокарава**.

На Віцебшчыне затрымалі аўтамабіль, у якім ехаў **Аляксандар Мілінкевіч**: міліцыянты заявілі, што падазраюць машыну ў дарожна-транспартным здарэньні зь сьмяротным вынікам.

**24 лістапада**

У Бабруйску затрымалі моладзевага актывіста **Валера Мацкевіча**: сьпярша зьвінавацілі ў крадзяжы, потым — у разбойным нападзе. Урэшце склалі пратакол за «распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных зьвестак».

Моладзевых актывістаў **Яраслава Грышчэню** й **Арцёма Латаеўскага** затрымалі ў Баранавічах за тое, што хлопцы вывесілі нацыянальны сьцяг на адным з будынкаў.

**26 лістапада**

У Віцебску каля помніка Караткевічу падчас юбілейных сьвяткаваньняў затрымалі невядомую **дзяўчыну**.

Падчас сэмінару па праблемах гендэрнага балянсу ў Магілёве міліцыянты затрымалі прадстаўнікоў швэдзкіх, украінскіх і літоўскіх недзяржаўных арганізацыяў. Кіраўніцы групы, прэзыдэнту швэдзкага культурнага цэнтру **Марыі Суінсэн** выпісалі штраф у 10 базавых велічыняў. Перад візытам міліцыянтаў замежнікаў здымала група БТ.

**АШ**

Узгадваю размову з адным баўгарынам, які прыяжджаў сюды дзеля абмену досьведам у справе «аксамітных рэвалюцыяў» — у свой час ён быў актыўным удзельнікам вулічных выступаў, што зрынулі спачатку камуністаў, а затым і іхніх спадкаемцаў — сацыялістаў. «Праглядаў запісы ўсіх вашых апошніх дэманстрацыяў, — казаў мне ён, — і нічога не разумею. Чаму ў вас наперадзе заўсёды ідуць дзеці? У нас студэнтаў, а тым больш школьнікаў запіхвалі глыбей у калёну — тут жа справа сур'ёзная. Тое самае ў грузінаў, азэрбайджанцаў, сэрбаў... Увогуле, дзе вашыя мужыкі?»

І праўда: увогуле, дзе нашыя мужыкі?

Мужчынскія ўчынкі ў сёньняшняй Беларусі — зьява настолькі рэдкая, што кідаецца ў вочы. Вось Аляксандар Казулін галадуе больш за месяц. Вось Аляксандар Мілінкевіч, запісаны ў ініцыятыўныя групы больш як 200 апазыцыйных кандыдатаў, езьдзіць па ўсёй краіне й добрасумленна зьбірае подпісы. Вось Мірон уздымае чарговы бел-чырвона-белы сьцяг па-над Віцебскам. Маладафронтаўцы, у якіх перасаджалі ўсіх лідэраў, пад пагрозай 193 артыкулу Крымінальнага кодэксу працягваюць акцыі пратэсту й выходзяць на плошчу.

Беларусь — краіна хрысьціянская, і таму патрыярхальная. Мужчына — кармілец і абаронца, апірышча сям'і й лідэр грамадзтва. Калі цяперашнія мужыкі не адчуваюць роднае зямлі пад нагамі й Госпада Бога па-над сабой, сьпіваюцца, губляюць волю й гонар, ператвараюцца ў мэблю ва ўласнай хаце — гэта разбурае і сям'ю, і працу, і нацыю.

Беларусі наканавана трымацца на моцных мужчынах. Бо «жонцы галава муж» і «кожнаму мужу галава — Хрыстос» (Да Карынцянаў 11:3).

На жанчынах Беларусі ня выцягнуць. Горы работы й нетры занядбанага багацьця, вяршыні творчасьці й далягляды духу, вуліцы й начныя дахі чакаюць сапраўдных беларускіх мужчынаў.

Мужыкі! Досыць сьпівацца, лайдачыць і хавацца па кухнях. Пад'ём!

Гэта нашая рызыкоўная, руплівая, цяжкая мужчынская справа — нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

«Чаму ў вас наперадзе заўсёды ідуць дзеці? У нас студэнтаў і школьнікаў запіхвалі глыбей у калёну».




**У нядзелю ў Менску прайшла кічавая акцыя-пэрформанс «Шукаем жулікаў», выкліканая заявамі аб тым, што прэзыдэнцкія выбары былі сфальсыфікаваныя. Моладзь шукала таямнічых фальсыфікатараў, што «скралі 400 000 галасоў у Лукашэнкі», раздавала іранічныя ўлёткі. Некаторыя мінакі, пабачыўшы чырвона-зялёную сымболіку, не разьбіраліся ў сытуацыі: пасылалі куды далей «бээрэсэмаўскіх падхалімаў». «Такая рэакцыя ня можа ня радаваць», — зазначаюць удзельнікі акцыі.**



# Пальцы на горле

Менск спрытна выкарыстоўвае міжнародныя супярэчнасьці па ўсіх азімутах. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.




Памятаеце вобраз «горла Расеі і Заходняй Эўропы»? Гэтая мэтафара вырвалася з вуснаў Аляксандра Лукашэнкі, калі ён казаў украінскім журналістам пра патэнцыял гіпатэтычнага хаўрусу між Менскам ды Кіевам.

Гэты вобраз падаецца ці не галоўным. Зь яго вынікае наступнае:

— першы беларускі прэзыдэнт жыве катэгорыямі барацьбы, нават калі кажа пра супрацу;

— па вялікім рахунку, ён пачуваецца чужым як для Захаду, так і для Масквы;

— ён гатовы напоўніцу скарыстацца тымі супярэчнасьцямі геапалітычнага, нават цывілізацыйнага кшталту, што існуюць і яшчэ доўга (заўжды?) будуць існаваць між Эўропай і Расеяй.

І ня толькі між гэтымі вялікімі гульцамі. Не выпадкова нарадзілася ідэя «вялікай дугі» вонкавай палітыкі.

Можна кпіць з пэрспэктываў здабычы нафты ў басэйне Арынока, але факт тое, што ў сёньняшнім разадраным, пастаўленым на вушы сьвеце айчынная дыпляматыя мае абсяг для манэўру. Антыамэрыканісты, фундамэнталісты, папулісты — партнэраў, якія адгукаюцца з паўслова, досыць багата.

І гаворка ня толькі пра маргіналаў. Ва ўсякім разе, энэргетычнае супрацоўніцтва, якім Менск спакушае, напрыклад, Украіну і Азэрбайджан, цалкам мае пэрспэктыву. Бо Лукашэнкава тэза «і нікому б ня кланяліся» цалкам пераканаўчая і для Ющанкі, і для Януковіча, і для Аліева, і для любога нармальнага лідэра сувэрэннае дзяржавы.

Ды і Барозу з Салянам, і Мэркель з Шыракам таксама кіруюцца імпэратывамі Realpolitik.

Засьцерагаючыся энэргетычнага дыктату Крамля, яны сёньня міжволі падладжваюцца ці могуць падладзіцца пад беларускую ўладу.

Глядзеце: яна фактычна з парога наладзіла абструкцыю новай стратэгіі ЭЗ. І разам з тым — займела піяраўскі плён, бо магчымасьць торгу застаецца.

Між тым зноў разьвярэджаныя фобіі расейскіх элітаў датычна таго, што сінявокая хаўрусьніца можа ў любы момант здрадзіць з Брусэлем. Бач, той ужо прапануе шлюбны кантракт!

Нават заява пра фальсыфікацыю мінулых выбараў, якая, здавалася б, мусіла выклікаць сусьветны фурор, боўтнула, як у балота. Ні Крамлю, ні Эўразьвязу цяпер усчынаць звон не выпадае. Маскве, якая падтрымала трэці тэрмін, тут увогуле толькі маўчаць у анучку. Дый Брусэль як мыла зьеўшы. Іначай — адразу пытаньне: а чаго ж вы гэнаму «нелегітымнаму» толькі што пернік прапанавалі?

Карацей, моўчкі праглынулі заяву, сэнс якой: у сябе дома што хачу, тое і раблю!

Бачыце, як лёгка кладуцца пальцы на «горла Расеі і Заходняй Эўропы»?

Канечне, наіўна лічыць, што ў тых гульцоў няма козыраў. Але, што б ні казалі, рэжым спрытна гуляе на калізіях між Захадам ды Ўсходам (маецца на ўвазе ня толькі Расея, але і Кітай, мусульманскі абсяг). А таксама між Поўначчу і Поўднем (вазьмеце ўкараненьне ў Рух недалучэньня).

Карацей, Менск выкарыстоўвае міжнародныя супярэчнасьці па ўсіх азімутах.

Таму прагнозы, што рэжым вось-вось апынецца між молатам ды кавадлам, мусіць, збольшага выдаюць жаданае за існае. Хутчэй што ў нейкай пэрспэктыве спрацуюць працэсы эрозіі.

# Як нам захаваць СНД?



Фэльетон Лёліка Ушкіна.



23 лістапада Моладзь БНФ вывесіла расьцяжку над вуліцай Няміга «Віншуем «Нашу Ніву» са 100-годзьдзем. Моладзь БНФ». Гэта самае сьмелае зь віншаваньняў газэце. Дзякуй!

Менскі саміт СНД — першы ў гэтай арганізацыі, калі скандальны аспэкт зацьміў палітычны. Ці ня ёсьць скандал той самай новай цудоўнай выратавальнай канцэпцыяй, якая можа захаваць СНД?

Давайце на хвілінку ўявім, што ніякага скандалу ў Менску на гэтым тыдні не было. Ні «прыпонаў» журналістам «МК» і «Ъ» на ўваходзе ў чупа чупс. Ні дэмаршу іхных расейскіх калегаў. Ні Пуціна, які хаваецца ад аб’ектываў чэсных журналістаў, пакуль тыя ў сваю чаргу, намагаючыся пратараніць карэ ягоных бодзігардаў, енчаць: «Што вы робіце, гады, у нас з вамі адна саюзная дзяржава!»

Што ў такім выпадку мы атрымалі б з інфармацыйных стужак?

«Кіраўнікі дзяржаваў СНД загадалі Савету Міністраў замежных справаў Судружнасьці распрацаваць канцэпцыю рэфармаваньня арганізацыі... саміт судзейнічаў пашырэньню рэгіянальнага супрацоўніцтва... важны крок на шляху абмену прававаой інфармацыяй...»

У гіце сусьветных навінаў такога кшталту пісульлкі саступаюць месца нават прэс-рэлізу дырэкцыі сыднэйскага заапарку аб тым, што самка гіпапатама разрадзілася трыма альбіносамі.

Саміт, а з улікам крызісу СНД, магчыма, і ўвесь праект постсавецкай інтэграцыі, выратаваў гучны скандал вакол тых самых расейскіх журналістаў.

Гэта павінна выклікаць у галовах Рушайлы і іншых адказных за ідэю захаваньня СНД адпаведныя мазгавыя канвульсіі.

Магчыма, VIP-скандалы і ёсьць новай філязофіяй СНД.

Пры гэтым Рушайлу ня трэба рабіць стаўку на лёс.

Было б файна за месяц да наступнага курултаю лідэраў Судружнасьці ў часопісе Расейскай фэдэрацыі целаахоўнікаў «Бацяня-камбат» друкануць артыкул «Родзічы Рахмова ня могуць зьлезьці з траўкі». Пасьля гэтага на саміце ў Душанбэ целаахоўнікаў Пуціна не дапускаюць у залю паседжаньняў. У адказ на гэта ў знак карпаратыўнай салідарнасьці ўсе целаахоўнікі звальваюць з саміту. Смак!!!

З акторамі пытаньняў ня будзе: ня зьніклі яшчэ прэзыдэнты-фрыкі, якія вераць, што Судружнасьць мае будучыню. Яны маральна гатовыя праявіць свае акторскія таленты.

Напрыклад, у Душанбэ адзін прэзыдэнт (зразумела, адпаведна з сцэнаром) можа запатрабаваць адзінай вольнай эканамічнай зоны гандлю эратычнымі часопісамі, другі — пашырэньня абмену інфармацыяй аб тым, з кім гуляе Пэнэлёпа Круз. У трэцяга падчас саміту «выпадкова» з кішэні можа вытрусіцца пакецік з грашыма. Чацьверты хай заявіць, што пяты яго дастаў...

Іншым спосабам вы цікавасьць да СНД не захаваеце!

# Якія правы мае ў нас акцыянэр?

Не запрасілі ні на адзін сход, ня выплацілі капейкі дывідэндаў, а цяпер яго з замілаванасьцю просяць перадаць бязвыплатна акцыі «Маладэчнапіва» на... добраахвотнай аснове.

У кастрычніку гэтага году акцыянэры ААТ «Маладэчнапіва» атрымалі цікавыя пакеты. Урывак з праграмнага звароту да «паважанага акцыянэра» дырэктара ААТ Л.Нехвядовіча нельга не прывесьці. Хоць ён і вялікі, але ж надта калярытны: «Вступил в силу Указ Президента от 28 августа 2006 №538 «О мерах по финансовому оздоровлению убыточных акционерных обществ» (далее — Указ). К Указу прилагается перечень убыточных акционерных обществ, в который включено и ОАО «Молодечнопиво». Суть данного Указа заключается в том, что убыточным акционерным обществам предоставляется отсрочка на 5 лет по уплате налогов, сборов (пошлин), бюджетных ссуд и других платежей в республиканский и местный бюджеты. Одним из обязательных условий оказания государственной поддержки согласно пункту 2.2 Указа является: «доведение не позднее шести месяцев со дня опубликования настоящего Указа до 100 процентов путем безвозмездной передачи в собственность Республики Беларусь или административно-территориальных единиц акций, принадлежащих акционерам (кроме акций, принадлежащих Республике Беларусь и административно-территориальным единицам), в том числе акций, приобретенных гражданами Республики Беларусь за денежные средства на льготных условиях и в обмен на именные приватизационные чеки «Имущество».

Яшчэ ў атрыманым пакеце быў канвэрцік з гатовымі, акуратненька запоўненым зваротным адрасам. Туды трэба ўкласьці цёпленькае заяўленьне, куды ўнесьці ўсяго толькі сваё прозьвішча, дату і подпіс. Заява гэтая — таксама вяршыня славеснасьці: «Прошу принять безвозмездно акции, принадлежащие мне, как акционеру ОАО «Молодечнопиво» в количестве __ штук стоимостью 3 300 руб. за одну акцию на общую сумму ___ рублей, в коммунальную собственность Молодечненского района на добровольной основе».

Што гэта? Ці ўлады наверсе забыліся, што ў нас самая прагрэсіўная, самая народная дзяржава ва ўсёй акрузе? Ці то мясцовыя цуда-кіраўнікі ў свой час вучыліся на тройкі, а цяпер грошы і страх перад начальствам затлумілі ў галовах астаткі здаровага сэнсу і гламазьдзяць вось такія пісулькі? Пра сумленьне гаварыць тут не да месца. Ну, гляньце: чалавека не запрасілі ні на адзін сход акцыянэраў, ён ня бачыў аніякіх дывідэндаў, а цяпер яго з замілаванасьцю просяць (можа, лепей, каб енкам енчыў!) перадаць бязвыплатна свае акцыі (!) на добраахвотнай аснове (!!!). Людцы, дзе мы жывем: дзе рэальнасьць, а дзе фантасмагорыя? Зразумела, што ў рынačных умовах розныя эканамічныя аб'яднаньні будуць з рознай ступеньню посьпеху ўзьнікаць, існаваць у добрым здароўі і лопацца, але ж у гэтай сытуацыі ў людзей патрабуюць здаць акцыі *пад сьцягам дзяржавы і прэзыдэнта...*

**Сяргей Брадавы, Маладэчна**

## «Апазыцыйны» пісьменьнік — «апазыцыйная літаратура»?

**На філфаку БДУ адбыўся інцыдэнт.** Неафіцыйным распараджэньнем кіраўніцтва загадана зьмяніць праграму правядзеньня чарговай рэспубліканскай навуковай канфэрэнцыі, бо на пленарнае пасяджэньне арганізатары мелі неасьцярожнасьць запрасіць «апазыцыйнага» паэта Ніла Гілевіча. А гэта, так бы мовіць, кідае цень на «палітычна граматную» пазыцыю ўнівэрсытэту і філялягічнага факультэту ў прыватнасьці. Ніл Гілевіч, клясык беларускай літаратуры і часты госьць да некаторага часу на філфаку, цяпер — persona non grata. Ня дзіва, што студэнты-філёлягі апошняга пакаленьня ў вочы ня бачылі ні Гілевіча, ні Барадуліна, ні шмат каго яшчэ.

**Тутэйшая**

## Прэмію далі «Мэдыцынскім весьнікам»

**У карэліцкай раённай больніцы пэрсанал прызвычаіўся атрымліваць пры канцы лістапада так званую навагоднюю прэмію.** Гэтым разам шмат каго чакаў непрыемны сюрпрыз. Пасьля таго, як чалавек расьпісваўся ў дакумэнце, ён даведваўся, што ягоная прэмія часткова ці цалкам пойдзе на падпіску. Такім чынам карэліцкая пошта выканала плян па падпісцы на раёнку ды «Мэдыцынскі весьнік».

Мэдыкам сказалі, што іхныя прэміяльныя ўжо пералічаныя на пошту. Людзі толькі абураюцца, але ніхто не наважваецца бараніць свае правы — кантракт трымае за горла. Кожны ведае, што прычыну для звальненьня знойдуць абавязкова, а знайдзі ты потым працу ў Карэлічах.

І тое ж датычыць ня толькі мэдыкаў, але і настаўнікаў ды іншых бюджэтнікаў.

**Пастаял-ка**

# Улады Горадні парушылі зацьверджаны Лукашэнкам плян рэканструкцыі

Гэта сьцьвярджаюць у БелНДІ «Горадабудаўніцтва». А колькі тыдняў таму ў Горадні зруйнавалі чарговую камяніцу — будынак старога млына, што побач з чыгуначным вакзалам.

Падчас будаўнічых працаў вясной—летам 2006 г. у Горадні Ўпраўленьне па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Мінкульту зафіксавала шматлікія парушэньні закону. Аб чым было зробленае афіцыйнае прадпісаньне. БелНДІ «Горадабудаўніцтва», які распрацаваў Генэральны плян Горадні (зацьверджаны прэзыдэнтам Беларусі ў 2003 г.), даў афіцыйную ацэнку працам, якія вядуцца ў Горадні сёньня: «На жаль, работы, што фактычна выконваюцца цяпер, не адпавядаюць вышэйпазначаным горадабудаўнічым праектам». У Міністэрства культуры быў накіраваны ліст, у якім падрабязна разглядаюцца парушэньні, зробленыя падчас рэканструкцыі вясной—летам 2006 г. Работам, якія плануюць правесьці гарадзенскія ўлады ў бліжэйшы час, даецца нэгатыўная ацэнка: «Заплянаванае будаўніцтва пярэчыць патрабаваньням Закону аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны». У лісьце таксама маюцца рэкамэндацыі па вывядзеньні руху гарадзкога транспарту ў абыход цэнтральнага гістарычнага ядра.

Гарадзенскія ўлады пакуль не рэагуюць на заўвагі міністэрства ды НДІ. «Рэканструкцыя» працягваецца. Паўмесяца таму ў раёне чыгуначнага вакзалу зруйнавалі будынак старога млына, каб потым... пабудаваць новы трошкі далей ад дарогі. Улады абяцаюць аднавіць млын і разьмясьціць у ім рэстарацыю ды невялічкі музэй.

На сайце harodnia.com разьмешчаная падрабязная інфармацыя пра рэакцыю Міністэрства культуры ды БелНДІ «Горадабудаўніцтва» на «рэканструкцыю» цэнтру Горадні, неабходныя кантакты, а таксама адрасы структураў, куды трэба зьвяртацца, і прыблізны тэкст звароту.

**Сямён Печанко**

# Ян Павал II у Беларусі

На канфэрэнцыі ў Менску сабраліся прэфэкт Кангрэгацыі каталіцкага выхаваньня з Ватыкану, кардынал Сьвёнтак, прафэсарка Здыбіцка.

У менскай Катэдры 25 лістапада адбыўся сымпозіюм «Ян Павал II — чалавек веры і культуры». Канфэрэнцыя завяршала год вялікага папы ў Беларусі. Для ўдзелу ў форуме сабраліся духоўныя асобы на чале з кардыналам Зянонам Грахалеўскім, прэфэктам Кангрэгацыі каталіцкага выхаваньня, ці, кажучы сьвецкай мовай, міністрам адукацыі Ватыкану, кардыналам Казімерам Свёнткам, Апостальскім нунцыям Марцінам Відавічам, біскупамі з усёй Беларусі. Прысутнічалі і прадстаўнікі Праваслаўнай Царквы, грамадзкіх арганізацый, амбасадаў, журналісты.

Першым выступіў кардынал Грахалеўскі, які распавёў пра дзейнасьць Яна Паўла II у каталіцкім навучаньні і выхаваньні, дакумэнты, якія рэгулявалі дзейнасьць касьцельных і каталіцкіх навучальных установаў. Касьцельныя — гэта тыя, што непасрэдна падпарадкоўваюцца Ватыкану, а каталіцкія навучальныя ўстановы ня маюць непасрэднага дачыненьня да сьвятога пасаду, гэта звычайныя школы ці ўнівэрсытэты, але выкладаньне і выхаваньне там заснаванае на каталіцкіх падмурках.

Пасьля II Ватыканскага Сабору колькасьць каталіцкіх навучальных установаў значна павялічылася. Цяпер унівэрсытэтаў у сьвеце больш за 1 300, а школ каля 200 000. Прычым яны карыстаюцца вялікай папулярнасьцю нават у тых краінах, дзе католікоў вобмаль, якіх 5—7%: Тайлянд, Тайвань, Румынія, Лібан.

Кардынал асабліва падкрэсьліў вагу каталіцкага навучаньня ў сучасным сьвеце, таму што веды бязь веры і любові часта становяцца прычынай не дабрабыту, а зла: новых відаў зброі і новых, больш жорсткіх войнаў.

На прэс-канфэрэнцыі працягнулася размова пра каталіцкую адукацыю. Біскуп Антоні Дзям'янка, адміністратар Менска-Магілёўскай архідыяцэзіі, распавёў пра тое, як арганізавана навучаньне рэлігіі на Беларусі, што ўсе нядзельныя школы пры касьцёлах цяпер праходзяць дзяржаўную рэгістрацыю.

Біскуп падкрэсьліў, што сёньня даволі цяжка пабудаваць новыя сьвятыні ў мікрараёнах буйных гарадоў, а менавіта там жыве найбольш дзетак, якіх трэба падрыхтаваць да Першай Камуніі.

Кардынал Казімер Сьвёнтак расказаў пра працу Вышэйшай духоўнай сэмінарыі Пінску. Асабліва адзначыў ён тое, што навучаньне праводзіцца цалкам пабеларуску прафэсарамі-беларусамі, якія вучыліся для гэтага ў каталіцкіх унівэрсытэтах Польшчы. Пакуль асноўная праблема тут, на думку кардынала, — брак беларускіх адпаведнікаў для лацінскіх тэрмінаў тэалёгіі і філязофіі,

**Біскуп Дзям'янка на сымпозіюме: Сёньня цяжка пабудаваць новыя сьвятыні ў мікрараёнах буйных гарадоў.**

але гэта ўжо толькі справа часу. І нагадаў, што ў 2007 г. адбудзецца першы выпуск сэмінарыі.

На сымпозіюме прагучаў таксама даклад кардынала Сьвёнтка пра адраджэньне Касьцёлу ў Беларусі падчас пантыфікату Яна Паўла II.

Прафэсар юрыспрудэнцыі Люблінскага каталіцкага ўнівэрсытэту і Ўнівэрсытэту кардынала Стэфана Вышынскага ў Варшаве, кансультант Папскай рады ў інтэрпрэтацыі праўных тэкстаў у Ватыкане ксёндз Юзаф Крукоўскі распавёў пра сувязі паміж паўсюдным і мясцовым касьцёламі ў сьвеце вучэньня Яна Паўла II.

Кандыдат гістарычных навук Алесь Жлутка расказаў пра гісторыю станаўленьня і разьвіцьця Касьцёлу на Беларусі ад апостала Андрэя да Яна Паўла II.

Зьмястоўна і цікава расказала пра спадчыну Яна Паўла II на беларускай мове пісьменьніца, галоўная рэдактарка часопісаў «Наша вера» і «Ave Maria» Крыстына Лялько, якая сама прыклала вялікія намаганьні для таго, каб кожны беларус змог далучыцца да багацьця твораў папы. Сёньня на беларускай мове выдадзены дзясятак энцыклік і кніг вялікага папы, сярод якіх і ягоны апошні твор «Памяць і самасьвядомасьць».

Сястра Зоф'я Здыбіцкая, прафэсарка, доктарка філязофскіх навук, былая дэканка філязофскага факультэту Люблінскага каталіцкага ўнівэрсытэту, у сваім дакладзе зьвярнула ўвагу прысутных на разуменьне чалавека ў філязофіі Яна Паўла II, на яго навуку любові. Здыбіцкая — адзін з найзначнейшых каталіцкіх філёзафаў сучаснасьці.

Падсумаваньнем дня стала сьвятая імша аб хутчэйшай кананізацыі Яна Паўла II, якую адпраўляў кардынал Зянон Грахалеўскі зь іншымі сьвятарамі. Падчас яе не пакідала адчуваньне, што вялікі папа пагладае на нас ня толькі зь вялікага партрэта каля аўтара, але непасрэдна ёсьць тут, цешыцца, што хоць такім спосабам зьдзейсьніў сваю мару — прыбыў на Беларусь.

Пасля сьв. імшы адбылася цырымонія ўзнагароджаньня пераможцаў у конкурсе ведаў пра Яна Паўла II і канцэрт хору *Organum*, які ў Кракаве калісьці заснаваў яшчэ Караль Вайтыла.

**Ларыса Дарашэнка**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Адкрыцьцё Канстантынопалю

Візыт Бэнэдыкта XVI у Турцыю — падзея выключна важная і ў рэлігійным, і ў гістарычным сэнсах.


REUTERS

Перадусім, гэта першы візыт новага папы ў мусульманскую краіну. Зважаючы на той несупынны ланцуг непаразуменьняў і правакацыяў, што спавіў чалавецтва на мяжы XX і XXI стагодзьдзяў, за гэтым візытам сочыць увесь сьвет. Турцыя чакае на ганку Эўропы ўжо не адзін дзясятак гадоў. Чаканьне абяртаецца нецярпеньнем. Толькі 10% турак цешацца з прыезду Сьвятога Айца. А больш за мільён выйшлі на вуліцы на апошнія выходныя, каб запярэчыць гэтаму. Таму гэты паездка вымагала вялікае чалавечае мужнасьці ад Папы. Але й надта шмат залежыць ад гэтага візыту.

Таму, не зважаючы на перасьцярогі (чакаюць нават тэракту), папа Бэнэдыкт XVI усё ж прыбыў 28 лістапада ў сталіцу Турцыі Анкару. У аэрапорце яго сустрэў прэм'ер-міністар краіны Рэджэп Эрдаган, а таксама герархі Каталіцкае царквы ў Турцыі.

Магчымасьць сустрэчы Папы з кіраўніком ураду Турцыі была пад вялікім пытаньнем, і тое, што яна адбудзецца, стала вядома толькі перад вылетам Папы з Рыму, адкуль яго даставіў спэцыяльны рэйс кампаніі «Аліталія» ў суправаджэньні самалётаў ВПС. Прэм'ер-міністар Турцыі падкрэсьліў гістарычную значнасьць Стамбулу як места, дзе сустракаюцца розныя культуры і цывілізацыі. Папа, у сваю чаргу, падтрымаў імкненьне Турцыі да ўступленьня ў Эўразьвяз.

Пасьля Папа дэманстратыўна наведаў маўзалей Мустафы Атацюрка, заснавальніка сёньняшняй, сьвецкай турэцкай дзяржавы і ўсклаў вянок на ягоную магілу. Пасьля сустрэўся з прэзыдэнтам Ахмэтам Нэджэтам Сэзэрам і з кіраўніком упраўленьня па справах рэлігіі муфціем Алі Бардакаглу. Першы дзень візыту завяршыўся сустрэчаю Бэнэдыкта XVI з дыпляматычным корпусам, акрэдытаваным у Турцыі.

На другі дзень Бэнэдыкт XVI езьдзіў ў старажытны Эфэс, дзе адправіў імшу. Санктуарый, які называюць «домам Марыі», пабудаваны на тым месцы, дзе пад апекаю сьвятога апостала Яна Багародзіца правяла апошнія гады свайго зямнога жыцця. Апоўдні па мясцовым часе Бэнэдыкт XVI у літургічных шатах зьявіўся ў сьвятыні. Яго тут віталі сабраныя вернікі і пілігрымы . Сымбалічна, што гэтае месца наведваюць ня толькі хрысціяне, але і мусульмане, якія таксама шануюць маці Хрыста.

Гэты санктуарый ужо наведвалі раней папярэднікі Бэнэдыкта XVI Павал VI і Ян Павал II. У сваёй прамове Папа згадаў асобу свайго папярэдніка Яна XXIII, які да свайго выбраньня працаваў Апостальскім Нунцыем у Турцыі і ўсталяваў добрыя адносіны зь мясцовым насельніцтвам. Сэнс прамовы Папы зводзіўся да неабходнасьці паважаць свабоду сумленьня і з павагаю ставіцца да незалежнасьці рэлігійных супольнасьцяў. «Безумоўна, я спадзяюся, што вернікі, незалежна ад таго, да якой рэлігійнай супольнасьці належаць, змогуць ажыцьцяўляць свае правы», — сказаў Папа.

Сьвяты Айцец цэлебраваў сьвятую Імшу, якая адбывалася пад дахам, усталяваным побач са сьвятыняй. У месцы ўсьпеньня Багародзіцы Бэнэдыкт XVI нагадаў, што «Ісус прыйшоў, каб прынесьці мір усім народам». Пантыфік зьвярнуў увагу на тое, што Царква павінна веставаць сьвету мір і быць прыладаю яго дасягненьня. Ён таксама падкрэсьліў, што Марыю ўшаноўваюць таксама вызнаўцы ісламу і што ў святой Імшы бяруць удзел прадстаўнікі некалькіх усходніх абрадаў каталіцкае царквы. Разам з тым Папа адзначыў, што хрысьціянская супольнасьць у Турцыі невялікая і штодзень сутыкаецца з праблемамі. Сваю гамілію ў турэцкай сьвятыні Папа завяршыў фразаю на турэцкай мове.

Малітва вернікаў чыталася на некалькіх мовах. З Эфэсу Бэнэдыкт XVI накіраваўся ў Стамбул. Там ён наведаў патрыяршы сабор Сьвятога Юр'я, дзе маліўся супольна з праваслаўным Патрыярхам Канстантынопальскім Варфаламеем I, пасьля чаго адбылася прыватная сустрэча паміж Папам і Патрыярхам. Ня выключана, што на ёй абмяркоўваліся й пытаньні злучэньня цэркваў.

Патрыярх Канстантынопальскі прасіў турэцкую супольнасьць напярэдадні прыезду папы не ствараць «непрыемных інцыдэнтаў» падчас папскага візыту. Праваслаўны патрыярх заявіў, што візыт Бэнэдыкта XVI — цудоўная магчымасьць для Турцыі пераканаць яго, што гэты край мусіць стаць часткаю Эўразьвязу. А да гэтага туркі даўно імкнуцца. Калі пратэсты супраць візыту Бэнэдыкта XVI ператворацца ў гвалт, то гэта будзе праблемаю найперш для Турцыі напярэдадні вызначальнага эўрасаміту ў сярэдзіне сьнежня. Варфаламей I перакананы, што і як мусульманская краіна Турцыя можа стаць часткаю супольнае Эўропы. Тут патрыярх цалкам мае рацыю, бо эўрапейцаў не бянтэжаць мусульманскія Босьнія й Альбанія. Іншая рэч, што насельніцтва Турцыі сёньня складае пад 70 мільёнаў чалавек і Турцыя здаецца небясьпечным канкурэнтам: сёньня эканамічным, а

Працяг на старонцы 22.

# Страшная сьмерць Аляксандра Літвіненкі

Увечары 23 лістапада ў лёнданскім шпіталі ў страшных пакутах памёр былы падпалкоўнік ФСБ Расеі Аляксандар Літвіненка. Тры тыдні таму яго атруцілі радыяактыўным палёніем. Сярод іншага былы выведнік займаўся незалежным расьсьледаваньнем забойства журналісткі Ганны Паліткоўскай.

У дзень меркаванага атручаньня ў Аляксандра Літвіненкі былі, як мінімум, дзьве сустрэчы. Раніцай ён піў гарбату ў адным зь лёнданскіх гатэляў з двума расейцамі — сваім сябрам былым ахоўнікам Беразоўскага Андрэем Лугавым і невядомым, якога звалі Ўладзімер, якога цяпер лічаць галоўным падазраваным. Пазьней Літвіненка абедаў у сушы-бары з італьянцам Марыё Скарамэлам.

Падпалкоўнік ФСБ Аляксандар Літвіненка ўцёк у Лёндан пасьля таго, як абнародаваў зьвесткі, якія нібыта сьведчаць аб падрыхтоўцы расейскіх спэцслужбаў да замаху на расейскага алігарха Барыса Беразоўскага, які атрымаў палітычны прытулак у Вялікай Брытаніі.

Аляксандар Літвіненка гэтаксама выдаў кнігу «ФСБ падрывае Расею», у якой сьцьвярджаў, што расейскія спэцслужбы арганізавалі выбухі жылых дамоў у Маскве ў 1999 годзе, каб стварыць падставу для разгортваньня ваеннай апэрацыі ў Чачэніі. Сябры і знаёмыя лічаць, што да атручваньня датычныя расейскія ўлады. Масква ў сваю чаргу катэгарычна абвяргае любую сувязь з тым, што адбылося.

Прэса «маскоўскі сьлед» дыскутуе. На думку «Гардыян», Літвіненка быў замалой птушкай, каб яму помсьцілі. Для «Таймз» жа падазроная сама частата, зь якой гінуць крытыкі пуцінскай вайны ў Чачэніі. Называюць і прозьвішча расейскага дыплямата, пэўнага Кірава, які быццам бы мог увесьці палёній у Брытанію.

Сьляды радыяактыўнага палёнія знайшлі ў пяці месцах у Лёндане, куды завітваў Літвіненка да шпіталізацыі. Скура яго выпраменьваньне затрымлівае, але калі палёній трапляе ўсярэдзіну арганізму, ён яго спальвае, і паратунку няма.

**МБ**

# Ягор Гайдар трапіў у больніцу з прыкметамі атручэньня



Былы выканаўца абавязкаў прэм’ер-міністра Расеі (пачатак 1990-х) Ягор Гайдар шпіталізаваны з прыкметамі атручэньня. *France Press* са спасылкай на *Financial Times* паведамляе, што Гайдару стала кепска яшчэ на тым тыдні, калі ён знаходзіўся ў Ірляндыі. Журналісту Гайдар паведаміў, што праблемы са здароўем зьявіліся 24 лістапада, пасьля зьедзенага ў дублінскім гатэлі сьняданку.

У Дубліне Гайдар прэзэнтаваў сваю кнігу «Сьмерць імпэрыі: урокі для сучаснай Расеі».

*Financial Times* піша, што кіраўнік РАА «ЕЭС России» і найбліжэйшы паплечнік Гайдара Анатоль Чубайс выказаў думку, што былога в.а прэм’ер-міністра спрабавалі атруціць. Але ён ня стаў вінаваціць у гэтым Крэмль альбо расейскія спэцслужбы.

Сам Гайдар пакуль ніякіх высноў і заяваў не рабіў.

**bbcrussian.com**

# Тыбэцкага Мірона арыштавалі

Калі ў студзені 2002 году тагачасны прэм’ер-міністар Кітая Жу Ронцзі наведваў Мумбай, малады тыбэцкі журналіст Тэнзін Цундуэ залез па рыштаваньнях на чатырнаццаты паверх будоўлі перад пяцізоркавым гатэлем, дзе жыў кітайскі прэм’ер, каб разгарнуць велізарны транспарант «Свабоду Тыбэту». Летась у Бангалоры Тэнзін раптам зьявіўся на даху 200-павярховага будынку акурат над тым будынкам, дзе Ван Цзібао, наступнік Жу Ронцзі, сустракаўся з індыйскімі навукоўцамі. Рызыкуючы жыцьцём, ён кідаў мінакам улёткі, выгукваючы «Ван Цзібао, вы ня можаце прымусіць нас маўчаць».

У аўторак пільныя індыйскія ўлады, напярэдадні прыезду кітайскага кіраўніка, выкарысталі забыты артыкул Крымінальнага кодэксу часу брытанскага панаваньня і пасадзілі Тэнзіна пад хатні арышт у гімалайскім месьце Дхарамсала. Там у выгнаньні жыве Далай-Лама і сто тысячаў тыбэцкіх уцекачоў. Кітай захапіў Тыбэт у 1950 г.

**Сяргей Богдан**


REUTERS

# Мэрам Варшавы ўпершыню стала жанчына

Былая старшынька Нацбанку Польшчы і віцэ-прэзыдэнт Эўрапейскага банку рэканструкцыі і разьвіцьця Ганна Гранкевіч-Вальц (**на фота**) на муніцыпальных выбарах апярэдзіла былога прэм’ер-міністра Казімежа Марцінкевіча.

Яшчэ тры месяцы таму выканаўца абавязкаў мэра, сябра кіраўнічай партыі «Права і справядлівасьць» Казімеж Марцінкевіч быў бясспрэчным лідэрам апытаньняў грамадзкай думкі. Аднак у панядзелак Ганна Гранкевіч-Вальц атрымала 53% галасоў — на шэсьць адсоткаў болей ад Марцінкевіча.

Частка электарату левых партыяў і посткамуністаў, выбіраючы паміж прадстаўніком «Права і справядлівасьці», партыі, якую ўзначальваюць перакананыя антыкамуністы, і кандыдаткай ад лібэральнай «Грамадзянскай плятформы» Дональда Туска, сьледам за сваімі лідэрамі выбралі «меншае ліха».

На пытаньне, чаму Казімеж Марцінкевіч — адзін з найпапулярнейшых палітыкаў у Польшчы — прайграў, маецца некалькі адказаў. Па-першае, Марцінкевіч — не варшавяк, па-другое, сталічныя жыхары проста не маглі дапусьціць, каб кіроўная партыя атрымала акрамя пасадаў прэзыдэнта, прэм’ера, сьпікера парлямэнту яшчэ й фатэль мэра Варшавы.

У кампаніі Казімежа Марцінкевіча было зроблена колькі прыкрых абмылак. Супрацоўнікі ягонага штабу без дазволу выкарысталі ў кампаніі песьню пра Варшаву папулярнага рок-гурту. Затым зрабілі памылку, праграмуючы аўтамат, які тэлефанаваў варшавякам і ўключаў запіс з голасам кандыдата. Машына абудзіла дзясяткі тысячаў варшавякаў а другой-трэцяй гадзіне ўначы.



«Адзін той дзень, а дакладней ноч, тэлефанаваньняў паўплывала на выніку галасаваньня», — заявіў Марцінкевіч.

Апазыцыя выйграла выбары мэраў у Кракаве, Беластоку, Любліне, кіраўнічая партыя — у Лодзі, Радаме, Плоцку. У Познані і яшчэ шэрагу гарадоў перамаглі незалежныя кандыдаты.

**РМ**

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

**Мэрам Варшавы стала жанчына. А хто стане першай жанчынай-мэрам Менску?**

| | |
|---|---|
| Зінаіда Бандарэнка | 13 (20.3%) |
| Кацярына Карстэн | 2 (3.1%) |
| Іна Кулей | 26 (40.6%) |
| Анжаліка Агурбаш | 4 (6.3%) |
| Тацяна Сулімава | 3 (4.7%) |
| Лідзія Ярмошына | 16 (25.0%) |

**Усяго прагаласавала за дзень на 20.00 29 лістапада: 64**

# Галадамор прызнаны генацыдам украінскага народу

Падчас саміту СНД Вярхоўная Рада Ўкраіны прыняла рашэньне прызнаць галадамор 1932—33 гадоў генацыдам украінскага народу. Тады ў выніку сталінскае палітыкі загінула ад голаду некалькі мільёнаў украінцаў, а плыні ўцекачоў дасягнулі Беларусі.

Нягледзячы на супраціў камуністаў і прарасейскіх фракцый, пастанова прайшла 233 галасамі «за» ў варыянце, прапанаваным прэзыдэнтам Украіны Віктарам Юшчанкам з папраўкамі лідэра сацыялістаў, сьпікера парлямэнту Аляксандра Мароза.

Расея засьцерагала Ўкраіну ад прыняцьця такога рашэньня. Масква прэтэндуе на савецкую спадчыну і хоча, каб яна глядзелася харошай.



# Адкрыцьцё Канстантынопалю

**Працяг са старонкі 20.**

заўтра й духоўным.

Да таго, Усясьветны Патрыярх Канстантынопалю чарговы раз папрасіў турэцкія ўлады аб дазволе наноў адкрыць зачыненую ў 1971 годзе праваслаўную сэмінарыю на востраве Халкі, што існавала там стагодзьдзямі. Праваслаўных у Турцыю засталося некалькі тысячаў, але і яны могуць зьнікнуць, калі ім ня будзе сьвятароў.

Нібы ўсё адбылося як мае быць. Сьвяты Айцец Бэнэдыкт XVI сустрэўся з турэцкімі ўрадоўцамі й духоўнымі, праграма візыту не была сарванаю.

Але... Тымчасам Эўракамісія парэкамэндавала часткова перапыніць перамовы з Турцыяй аб яе ўваходжаньні ў Эўразьвяз.

Але... Каб не дражніць турэцкіх нацыяналістаў, якія імпэтна пратэставалі супраць візыту, сьвецкі прэзыдэнт Турцыі Сэзэр наклаў вэта на закон, што меў зраўняць у маёмасных правах немусульманаў з астатнімі жыхарамі краіны. А менавіта на гэтым законе настойваў Эўразьвяз. Выглядае, што нават да заканчэньня візыту пантыфіка яго вынікі ўжо з двух бакоў імкнуцца зьвесьці ў нішто. А Эўропа бяз Турцыі, як і безь Беларусі, няпоўная.

**Сяргей Харэўскі**

# Рэкорды лістапада

Сёлетні лістапад б'е тэмпэратурныя рэкорды. 27 лістапада ў Менску абсалютны максымум быў перавышаны на 1 градус — такое назіраецца ўпершыню. Апошні такі цёплы лістапад назіралі ў 2000 г.

Такое незвычайна цёплае для канца восені надвор'е пратрымаецца да пачатку сьнежня. Прыкладна з другога тыдню зімы тэмпература пачне паніжацца да характэрнага для гэтае пары ўзроўню. Пра гэта паведаміла начальніца аддзелу метэаралягічных прагнозаў Белгідрамэтцэнтру Надзея Мельчакова. Па яе словах такое цёплае надвор'е хоць і не характэрнае для нашай тэрыторыі, але здараецца ўсё часьцей. Нешта падобнае адбывалася ў 2000 годзе, калі дзякуючы цёпламу надвор'ю азіміна расла аж да сярэдзіны сьнежня. У гэтым годзе праз халодны і вільготны пачатак восені азіміну пасеялі пазьней. Але цяпер гэта й да лепшага, бо зь вяртаньнем цяпла вэгетацыя аднавілася. То праз тое спазьненьне расьліны не перарастуць лішне. Рэзкага пахаладаньня не прагназуецца, таму азіміна пасьпее прайсьці працэс загартоўкі.

Што можна дарабіць у садзе, карыстаючыся рэштаю цёплых дзянькоў? Да самага пачатку зімы можна садзіць дрэвы і кусты (акрамя костачкавых ды іншых цеплалюбівых расьлінаў). Пад пладовымі дрэвамі трэба прыбраць апалае лісьце, ачысьціць ствалы дрэваў ад хворай кары, зрэзаць засохлыя ды паламаныя галінкі. Вельмі важна добра паліць дрэвы, бо цягам зімы яны губляюць шмат вільгаці, асабліва ў моцныя маразы. Паліваць трэба ў баразну, пракапаную на адзін штых рыдлёўкі на адлегласьці даўжыні галінаў. Пры гэтым дрэвы варта падкарміць. Цяпер і ў вясковых крамах прадаюць збалянсаваныя для рознаўзроставых дрэваў угнаеньні. Каб не нашкодзілі зайцы, мусова абвязаць шчэпы яловымі лапкамі ці рубэройдам. Гэта заадно зьберажэ іх і ад моцнага марозу. Добры сродак ад марозу — фарбаваньне ствалоў белай фарбай. У адмысловых крамах прадаецца фарба з дамешкам меднага купарвасу, што засьцерагае дрэва ад шматлікіх хваробаў. Можна пабяліць па-старому — сумесьсю вапны, гліны і каравяку, дадаўшы туды трошкі купарвасу (на вядро вады бяруць 2 кг вапны, 1 кг гліны, 2 кг каравяку і 200—300 гр купарвасу). Фарбаваць варта да надыходу халадоў.

Аматарам ружаў таксама варта паклапаціцца пра сваіх прыгажуняў. Як толькі холад трошкі схопіць зямлю, карані кветак трэба ўцяпліць. Для гэтага можна выкарыстаць торф. Стволік варта абвязаць тканінай, хто прапускае паветра, а таксама лапікамі елкі. У гэты ж час можна пасадзіць тульпаны, нарцысы, касачы. А вось цыбуліны гладыёлусаў і вяргіняў канечне выкапаць, прасушыць і зьмясьціць на зіму ў халаднаватым месцы.

**Сямён Печанко**

КАЛЯНДАР

## Сьнежань

**1** — 75 гадоў з дня нараджэньня заслужанага архітэктара Беларусі Валянціна Малышава (1931).

**3** — 50 гадоў з дня нараджэньня піяністкі Ірыны Шумілінай (1956).

**10** — Дзень правоў чалавека.

**15** — Ханука ў юдэяў.

**19** — 100 гадоў з дня нараджэньня дырыжора, піяніста, кампазытара Мікалая Клаўса (1906—2001).

**23** — 175 гадоў таму (1831) загінула Эмілія Плятэр.

**25** — Божае нараджэньне ў каталікоў.

**27** — 75 гадоў з дня нараджэньня графіка Юр'я Карачуна (1931—1997).

**27** — 50 гадоў з дня нараджэньня мовазнаўца Аляксандра Рогалева (1956).

**29** — 50 гадоў з дня нараджэньня менскага рэжысэра тэатру лялек Мікалая Андрэева (1956).



# Двойчы «Наша Ніва»

У Менску адбыліся два ўрачыстыя сходы ў гонар 100-годзьдзя «Нашай Нівы» за адзін вечар. На іх было абвешчана пра будучую зьмену рэдактара газэты: замест Андрэя Дынька на гэтую пасаду прыходзіць Андрэй Скурко.

Пазбавіўшы Рэдакцыю «Нашай Нівы» магчымасьці правесьці сустрэчу з чытачамі ў прыдатнай залі, менскія ўлады дамагліся адваротнага: дзьвюх нашаніўскіх імпрэзаў замест адной. Абедзьве сустрэчы з чытачамі, якія прайшлі 23 лістапада ў невялічкай залі Ўправы БНФ ў Менску, не дублявалі, але дапаўнялі адна адну. Нават Лявон Вольскі пазьбягаў паўтарэньня ў выбары песень. Публіка таксама розьнілася: калі а 17-й палова залі складалася зь людзей сярэдняга веку, дык імпрэза а 19-й была спрэс моладзевай. Агулам на абедзьве сустрэчы прыйшло за 300 чалавек — болей заля папросту не зьмяшчала.

Прамоўцы апынуліся ня перад публікай, а ў яе гушчы.

Вёў праграму мастацтвазнаўца Сяргей Харэўскі, адзіны чалавек, які працуе ў «Нашай Ніве» ад 1991 году.

Пасьля яго слова ўзяў Андрэй Дынько. Ён апісаў сучасны стан газэты. Ніколі газэта ня мела столькі падпісчыкаў і чытачоў, як сёньня, сказаў ён. Ніколі, дзякуючы Інтэрнэту, яе аўдыторыя не расла так імкліва. Сп.Дынько таксама выказаўся на гарачыя тэмы сытуацыі. Ён сказаў — папярэдзіўшы, што не выключае, ягоныя словы будуць масава крытыкавацца, — што беларуская апазыцыя цяпер, у прынцыпе, усё робіць правільна. Галоўнае, каб у яе хапіла сілаў і стойкасьці ня збочыць са свайго шляху. У гэткім выпадку праз 20 гадоў Беларусь стане яшчэ адной скандынаўскай краінай.

Пасьля рэй вялі найстарэйшы аўтар сёньняшняй «НН» пісьменьнік Валянцін Тарас і наймаладзейшы супрацоўнік Зьміцер Панкавец.

Пасьля прамоваў на сцэну выйшаў Лявон Вольскі. Ён расказаў, што прастуджаны, але ня можа не засьпяваць. Апошняй Вольскі выканаў песьню «Не згаснуць зоркі ў небе», якую прысутныя пелі стойма, як гімн.

Выступіў пісьменьнік Уладзімер Арлоў, які неаднаразова сарваў мноства апляндысмэнтаў залі, ён зачытваў урыўкі са сваіх падарожных эсэ, якія цягам доўгіх гадоў друкавала «НН».

Напрыканцы вечарыны Андрэй Дынько згадаў першага рэдактара адноўленай «Нашай Нівы» Сяргея Дубаўца, без прароцкае волі якога ня быў бы магчымы гэты юбілей. Пасьля гэтага заля воплескамі вітала тых людзей, што разносяць штотыдзень газэты і проста ахвяруюць грошы на выхад.

Напачатку другой вечарыны літаратурны краязнаўца Ўладзімер Содаль распавёў пра тое, як прабіваў праз тэлевізійную цэнзуру перадачу пра старую «Нашу Ніву», не забыўшыся выказаць сымпатыю да адноўленай «НН».

Потым Андрэй Дынько праінфармаваў пра папярэднія і заплянаваныя нашаніўскія сустрэчы з чытачамі. Добра, лічыць ён, было распачаць іх у Бэрліне, а скончыць варта ў Маскве. Паводле ягоных словаў, Нямеччына ды Расея — надзвычай важныя для Беларусі партнэры, і псаваць іх імідж стэрэатыпамі, як тое робяць безадказныя палітыкі, няслушна.

Трымаючы новы нумар «НН», Сяргей Скрабец, былы палітычны вязень, выйшаў на сцэну. Павольна прамаўляючы па-беларуску, ён ўзрадавана вітаў моладзь, якая дае яму надзею, што дэмакратыя пераможа ў бліжэйшы час. «Я нават думаю, у наступным годзе», — дадаў ён. Скрабец нагадаў пра Аляксандра Казуліна і першым за гэты дзень гукнуў «Жыве Беларусь!».

Між тым праз шэрагі моладзі ўжо прабіваўся вэтэран-нашанівец Зьміцер Бартосік. Скінуўшы скуранку, ён правёў пальцамі па струнах ды завёў сьпеў пра «шалік белы з чырвонаю стужкай», запаліўшы зьнічкі ў вачах цудоўнай паловы залі.

Пасьля гэтага Ўладзімер Арлоў прэзэнтаваў урыўкі са сваіх эсэ для літаратурнай дэгустацыі. Ён асабліва падкрэсьліў тое, што ўпершыню ў жыцьці зьявіўся перад публікай у строгім гарнітуры і пры гальштуку — як-ніяк, нагода для выступу сур'ёзная.

Пісьменьніка зьмянілі маладафронтаўцы, якія ўручылі рэдактару «НН» ганаровы дыплём і прэмію, а Вольскі ня толькі зладзіў акустычны міні-канцэрт, але і прачытаў сваю казку «Пра ўвядзеньне агульнай формы адзеньня». «Які прыпеў сьпяваем?» —



спытаўся ён у залі, нечакана зрабіўшы паўзу падчас выкананьня «Трох чарапах». «Ты не чакай, чаканьне дастала!» — радасна адказалі чытачы, адмовіўшыся сьпяваць пра «сюрпрызаў ня будзе».

У канцы імпрэзы прагучала навіна. Андрэй Дынько сказаў, што мае намер бліжэйшым часам сысьці з пасады галоўнага рэдактара, а ягонае месца мае заняць Андрэй Скурко, чалавек, які пяць гадоў адпрацаваў намесьнікам рэдактара «Нашай Нівы». Сп.Дынько зазначыў, што ня сыдзе з асяродку газэты, а стане рэдактарам сайту nn.by.

**Зьміцер Панкавец, Алесь Кудрыцкі, Фота АК, Юрася Дзядзінкіна**



Выступае Сяргей Скрабец.

**«Рэпартэры бязь межаў» у абарону «Нашай Нівы»**

Міжнародная арганізацыя «Рэпартэры бязь межаў» асудзіла чарговыя спробы ўладаў зачыніць незалежную беларускамоўную газэту «Наша Ніва». У заяве адзначаецца, што на гэты раз «улады выкарыстоўваюць той факт, што ў газэты адсутнічаюць службовыя памяшканьні». Міжнародная журналісцкая арганізацыя нагадвае, што за тыдзень да 100-гадовага юбілею выхаду першага нумару газэты Міністэрства інфармацыі Беларусі вынесла газэце папярэджаньне. «Газэта «Наша ніва», пачынаючы з красавіка 2006 году, заключала чатыры кантракты на арэнду памяшканьняў, — гаворыцца ў заяве «Рэпартэраў бязь межаў». — Але кожны кантракт быў затым ануляваны пад ціскам уладаў».



Ад імя калектыву газэты «Салідарнасць» і Беларускай асацыяцыі журналістаў «Нашу Ніву» павіншаваў Аляксандар Старыкевіч, які падараваў Рэдакцыі шыкоўны букет.





Многа хто з моладзі бачыў Зьмітра Бартосіка ўпершыню.



# Дзеткі для газэткі



Малеча віншуе «НН» з Днём народзінаў.

Адзін з наведнікаў рагатаў, іншы румзаў, нехта залез на стол, хтосьці перапэцкаўся фарбай — у такой творчай атмасфэры прайшла ў нядзелю 26 лістапада чарговая імпрэза, прысьвечаная 100-годзьдзю «Нашай Нівы». Гэтым разам зь юбілеем газэту віншавалі яе наймалодшыя чытачы. У моладзевым цэнтры пры касьцёле Сьв. Яна Хрысьціцеля ў менскім раёне Серабранка сабраліся беларускамоўныя бацькі, згуртаваныя вакол дзіцячага інтэрнэт-парталу «Нашыя дзеткі» (http://www.dzietki.org).

Паўтара тузіна малых вадзілі карагоды, частавалі Капітана Танаку тортам ды сьпявалі радзімную песеньку. Акрамя гэтага яны ўрачыста перадалі журналістам самаробны постэр з абрысамі сваіх далонек, абведзеных флямастэрамі, ды з такім вершыкам:

Мы малюем шчыра, проста,  
Дорым вам «руку сяброўства».  
Не глядзіце, што малыя:  
Во далоні ўжо якія!  
Падрастаем мы, і самі  
Хутка станем чытачамі!





Кульмінацыяй вечара сталася прэзэнтацыя мультфільму «Наша Плястыляндыя» (па шматлікіх ды надта гучных патрабаваньнях гледачоў прэм’еру давялося паўтарыць разы чатыры), а таксама майстар-кляса па ляпленьні Капітана Танакі з плястыліну. У выніку насельніцтва плястылінавай краіны пабольшала на два дзясяткі рознакаляровых жыхароў.

Імпрэза давяла, што з дапамогай сваёй дзіцячай старонкі «Нашай Ніве» ўдалося прыцягнуць да сябе новае кола надзвычай патрабавальных чытачоў: прывабіць малечу штотыдзень заглядаць у чорна-белую газэту ня так і проста. Цяпер жа дзеткі ня толькі чытаюць, але і самі ствараюць «Нашу Ніву»: у чарговым выпуску «Плястыляндыі» водзяць карагоды новыя жыхары плястылінавай краіны, зробленыя рукамі нашых маленькіх чытачоў.

**Алесь Кудрыцкі, фота аўтара.**

# Прыгоды N.R.M. у Славакіі

Гурт N.R.M. нядаўна вярнуўся са Славакіі, дзе адыграў канцэрт на плошчы ў цэнтры Братыславы. Акцыя была прымеркаваная да 17-х угодкаў незалежнасьці краіны. Сцэна была ўсталяваная проста сярод скульптурнага комплексу, прысьвечанага падзеям Другой сусьветнай вайны. Апроч беларускіх музыкаў у канцэрце ўзяла ўдзел пані Кубішова з Чэхіі, якая пасьля падзеяў 68-га году за актыўную грамадзкую пазыцыю была пазбаўленая права займацца сьпеўнай творчасьцю аж да 1989-га. Яшчэ на канцэрце граў малады славацкі гурт «Пара». Лявон Вольскі піша пра паездку N.R.M. у сталіцу Славаччыны.

Па-першае, гэта было вельмі далёкае падарожжа — толькі ў адзін бок мы праехалі 1300 кілямэтраў. Прычым, ехалі зусім не па хуткаснай магістралі, а апошнія некалькі соцень кілямэтраў, наогул, — па горных пакручастых дарогах. Зрэшты, там вельмі прыгожыя краявіды, усе глядзелі на горныя рэчкі, мястэчкі, касьцёлы, так што й не заўважылі, як прыехалі.

Ад Братыславы да Вены — каля 60-ці кілямэтраў, да Будапэшту — 150. Прага таксама недалёка. Вельмі хацелася ўсё гэта наведаць, але не выпадала. Таму мы папросту пахадзілі па старым горадзе, папілі смачнага чэскага й славацкага піва, пашпацыравалі па беразе Дунаю, паглядзелі ў гатэлі мясцовыя тэлеканалы (славацкая мова, на дзіва, зразумелая для беларусаў!) і мусілі ехаць дадому.

Зь непрыемнага — на кожнай мяжы — Беларусі з Польшчай, Польшчы з Чэхіяй і Чэхіі са Славакіяй мы стаялі каля гадзіны. Нават калі не было чэргаў. Памежнікі тлумачылі: вы зь Беларусі, таму, даруйце, нам трэба ўсіх перапісаць, занесьці дадзеныя ў кампутар і г.д. Такі цяперашні парадак. З прыемнага — піва ў чэскім супэрмаркэце «Lidl» каштуе на нашыя грошы каля 300 рублёў.

На адваротным шляху прaглядзелі «Востраў» Лунгіна і некалькі дзясяткаў сэрыяў бясконцае эпапэі X-FILES.

Калі ўжо мы будзем у Беларусі граць на ўгодках незалежнасьці?

**Паводле «Тузіну Гітоў»**

# Океан Ельзи: «Касіў Ясь канюшыну!..»

**Чаму другім пасьля Менску месцам выступу слыннай украінскай мэйнстрым-каманды сёлета стаў менавіта Гомель, цікавіла многіх.** «Прынамсі, знайшлося годнае прымяненьне нядаўна збудаванаму навюткаму лядоваму палацу ў слаўным горадзе над Сажом», — падумаў я, і мы зазьбіраліся ў дарогу. Упяцёх апынуліся, нібы ў казцы, на галоўным праспэкце неўміручага Леніна. Ленін тут усё яшчэ жывы і сям-там нават жывейшы за некаторых жывых. Дарэмна мы заходзілі ў сувэнірныя крамкі (поўныя цішотак з Ільлічом) папытацца, дзе знаходзіцца Палац Румянцавых-Паскевічаў — галоўная славутасьць гораду. Тамака пра такі й знаць ня ведалі.

Урэшце адшукалі самі. Апартамэнты падноўленыя да непрыстойнага (от бы князёве пазабавіліся, пабачыўшы ў сваіх пакоях кандыцыянэры й партрэты спадара Грамыкі на ўсю сьцяну!). Заўважыўшы ў адным з пакояў рарытэтны нумар маскоўскага часопісу за 1975 г. з загадкавым кодам, мусібыць, самаідэнтычнасьці беларусаў у загалоўку «Корни русской ориентации армянского народа», мы ледзь стрымлівалі сьмяшынкі, каб не падацца нявыхаванымі блюзьнерамі супрацоўніцам музэю, якія да прадстаўнікоў «менскіх інстытутаў» ставіліся чамусь вельмі паважна. Хуценька даведаўшыся, што Кірыла Тураўскі быў «епископ и старорусский писатель» і аніяк не інакш, вырашылі больш не псаваць уражаньняў ад пагожага ветлага дня ў садова-паркавым ансамблі на беразе Сажа й накіраваліся наўпрост да Лядовага палацу, дзе з украінскімі музыкамі прабылі ад саўнд-чэку да апошняга поціску рук на разьвітаньне.

Канцэрт быў апасродкаваны на беларускія рэаліі. Калі на сцэне запанавала вясновая тэматыка — выконваліся песьні «Майже весна» й «Ото була весна», — эльзаўцы, замiж пройгрышу апошняй песьні, зьнячэўку выпалілі ладны кавалак «Касіў Ясь канюшыну» па-беларуску!!! За што й атрымалі пасьля канцэрту ў падарунак дыск «Сьвяты Вечар» з гітамі ўжо новага пакаленьня.

Пасьля канцэрту зморaных музыкаў чакаў невялічкі брыфінг для журналістаў. Лідэр «ОЕ» ані не шкадуе пра свой удзел у падзеях Майдану, калі ў першыя дні стаяў ля дзьвярэй Кіеўскага дзяржунівэрсытэту й заклікаў студэнтаў ісьці не на лекцыі, а вырашаць лёс краіны на плошчу. «І калі б заўтра спатрэбілася, не вагаючыся зрабіў бы тое самае...» А самым вялікім мінусам рэвалюцыі Вакарчук назваў тое, што яна была неабходная. «Хацелася ўсё ж, каб нашая краіна пераадолела цяжкасьці свайго гістарычнага разьвіцьця якім-небудзь іншым шляхам, але як што ў нас не было іншага выйсьця, я лічу, мы зрабілі слушны выбар, чым не зрабіць ніякага». І, нямала павесяліўшы прысутных сваёй дасьціпнасьцю, лідэр «Океану» скончыў гэтую тэму: «Я перафразую аднаго вашага друга: МЫ ВЕРЫМ У БЕЛАРУСЬ!!!»

«Океан Ельзи» паабяцаў налета прыехаць у Беларусь зноў — адразу пасьля таго, як увесну выйдзе новы альбом. Напасьледак шчэ разу цалкам сур’ёзна пажадаўшы нам не здавацца бяз бою і верыць у перамогу, украінцы адправіліся ў Днепрапятроўск абсалютна не пакінуўшы па-за сабою дваістага ўражаньня. Нават зоркі шоўбізнэсу не перастаюць быць сумленнымі грамадзянамі свае краіны й дбалымі рупліўцамі на ніве роднай культуры.

**Алесь Квіткевіч, фота Насты Грэскай,**
*Гомель — Менск*



**Сьвятаслаў Вакарчук не шкадуе пра ўдзел у падзеях Майдану. На фота: музыка дорыць кветкі міліцыянтам падчас украінскае рэвалюцыі.**

КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Разьвітальны фільм Робэрта Олтмэна

**Кампаньёны** (Prairie Home Companion).

ЗША, 2005, каляровы, 100 хв.

**Жанр:** драма.

**Адзнака:** 6,5 (з 10).

Карціна «Кампаньёны», якая дэманструецца на нашых экранах, стала апошнім фільмам кінаклясыка Робэрта Олтмэна, які днямі памёр. Олтмэн праславіўся трагікамічным гратэскам «Перасоўны ваенна-палявы шпіталь», сацыяльна-крытычным «Нэшвілам» і жорсткаю апрацоўкаю вэстэрну «Маккэйб і місіс Мілер». З апошніх твораў Олтмэна — «Гатовае адзеньне» пра высокую моду і «Гулец» пра норавы Галівуду.

Олтмэнаўскі стыль адмысловы. Гэта трапныя скрываваныя дыялёгі, атмасфэра бурлеску і праўды, сацыяльная крытыка і выкшталцоная акторская гульня. Найлепшыя зоркі біліся за права працаваць з Робэртам Олтмэнам і часам здымаліся ў ягоных аўтарскіх драмах за сымбалічныя грошы.

У карціне «Кампаньёны» — Ўудзі Гарэлсан і Мэрыл Стрып, Томі Лі Джонз і Гарысан Кейлар. Фільм мае ўсе прыкметы олтмэнаўскага стылю. 50-я гады. Апошняе радыёшоў. Акторы выкладаюцца напоўніцу, а за кулісамі віруе жыцьцё...

Каўбоі-сьпевакі зь непрыстойнымі кпінамі, дзяўчына, якая баіцца выступаць на сцэне, і нават прывід, які не жадае даравацць радыёжартаў. Усё зьмяшалася на гэтай сцэне: настальгія, жыцьцё, сьмерць. Гэта «Вішнёвы сад» па-амэрыканску і балючае разьвітаньне Робэрта Олтмэна.

**Андрэй Расінскі**




ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

## Субота, 2 сьнежня

**«Лад», 18.00**

«Фантамас».

Францыя—Італія, 1964, рэж. Андрэ Юнэбэль.

Прыгоды.

Бліскучая экранізацыя забытых коміксаў пра Фантамаса. Падарунак дарослым і дзецям. Эксцэнтрычны камісар Жуў (Люі дэ Фюнэс) і журналіст Фандор (Жан Марэ) спрабуюць схапіць геніяльнага злачынцу — Фантамаса, які зьмяняе абліччы, як пальчаткі, і якому слугуе тэхніка. У ролі няўлоўнага Фантамаса зь фірмовым «Ха-ха-ха!» таксама Жан Марэ.

**БТ, 19.10**

«Суфлёр».

Францыя, 2005, рэж. Гіём Піксі.

Рамантычная камэдыя.

Просьценькая гісторыя пра пакуты сарамлівага закаханага. Фэлікс працуе суфлёрам у тэатры й зусім не прыстасаваны для рэальнага жыцьця. Каб спакусіць жанчыну, ён піша сам для сябе рэплікі — у амплюа донжуана. На прынаду трапляецца Кляра, якая вырашае павячэраць з «нахабным» героем. І што цяпер рабіць з прыдуманай маскай?

**СТВ, 20.20**

«Гоншчык».

ЗША—Канада—Аўстралія, 2000, рэж. Рэні Харлін.

Спартовая драма.

Узыходнай зорцы аўтагонак Джымі Блаю бракуе досьведу. Настаўнікам Джымі становіцца былы чэмпіён Джо Тэнт. Для Тэнта гэта ня толькі шанец зрабіць юнака каралём арэны, але ізноў даказаць сваю прафэсійную годнасьць.

Рэні Харлін — прафэсійны камэрцыйны аўтар, у творчасьці якога амаль не бывае асечак. Адмысловыя эфэкты (на стварэньне аднаго зь іх пайшло два месяцы) зробленыя вельмі старанна.

У ролях: Сыльвэстар Сталонэ, Тыль Швайгер.

**АНТ, 23.20**

«Карты, грошы, дзьве рулі».

Вялікабрытанія, 1998, рэж. Гай Рычы.

Крымінальная камэдыя-трымценьнік.

Чатыры абібокі назапасілі грошы і ўшчэнт прайграліся бандзюгану-махляру. Бандыт зь пяшчотнай мянушкай Гары-Сякера даў тыдзень, каб вярнуць пазыкі, інакш герою штодзень будуць адсякаць па пальцу. І тады сябры вырашылі абрабаваць «батанікаў», якія гатуюць марыхуану для мясцовага наркабарона...

Хуліганскае завадное кіно тарантынаўскага разьліву, якое само сталася папулярным і прынесла славу Гаю Рычы.

**СТВ, 00.05**

«Я не баюся».

Італія—Гішпанія—Вялікабрытанія, 2001, рэж. Габрыеле Сальваторэс.

Псыхалягічны трымценьнік.

Італія 70-х. Вясковая ідылія. Але аднойчы 9-гадовы Мікеле знаходзіць хованку са страшнай і яшчэ жывой пачварай. Гэта зьнявечаны й скрадзены калісьці хлопчык. І самае страшнае, што выкрадальнікі дзіцяці — сваякі Мікеле. З гэтага моманту герой пастаўлены перад выбарам. Калі вакол пануе лютасьць, няпроста сказаць «Я не баюся» — але чалавечнасьць гэтага вымагае.

Прызы «Давід» за лепшае апэратарскае майстэрства й рэжысуру. Намінацыя на «Залатога мядзьведзя» Бэрлінскага кінафэсту.

## Нядзеля, 3 сьнежня

**«Лад», 19.50**

«Мадыльяні».

ЗША—Францыя—Нямеччына—Вялікабрытанія—Румынія, 2004, рэж. Майкл Дэйвіс.

Біяграфічная драма.

Парыж, 1919 год. Мастак Мадыльяні жабруе, але ведае моц свайго таленту. Герой кідае выклік Пікасо, які добра пачуваецца на маёмасным і мастацкім алімпе...

Атмасфэрычная пранізьлівая драма пра аднаго з найцікавейшых творцаў XX стагодзьдзя. У ролі Мадыльяні — Эндзі Гарсія.

**БТ, 22.25**

«Кроў і віно».

ЗША—Вялікабрытанія, 1996, рэж. Боб Рафэлсан.

Крымінальная драма.

Гандляр віном Алекс Гейтс разам з прыяцелем крадзе дыямэнты. Ды толькі пасынак Алекса ўцякае разам з дыямэнтамі...

Галоўная прынада карціны – Джэк Нікалсан у ролі гандляра Алекса.

**НТВ, 23.15**

«Кава і цыгарэты».

ЗША—Японія—Італія, 2003, рэж. Джым Джармуш.

Драма.

Чорна-белыя стылёвыя навэлі, аб'яднаныя кавай, цыгарэтамі, зоркавым складам і адмысловай іроніяй Джыма Джармуша.

**Андрэй Расінскі**

## ТЭАТРЫ

**опэра**
*На сцэне Цэнтральнага дому афіцэраў*
**2 (сб)** — «Рыта, альбо Пірацкі трохкутнік», «Джані Скікі».
**3 (ндз)** — «Чароўная музыка».
**3 (ндз)** — «Яўген Анегін».
**8 (пт)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**9 (сб)** — «Царская нявеста».
**10 (ндз)** — «Кармэн».
*Малая заля імя Р.Шырмы*
**10 (ндз)** — «Ад клясыкі да сучаснасьці».

**Купалаўскі тэатар**
**1 (пт)** — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**2 (сб)** — «Таполевая завея».
**3 (ндз)** — «Паўлінка».
**4 (пн)** — «Смак яблыка».
**6 (ср)** — «Памінальная малітва».
**7 (чц)** — «КІМ».
**8 (пт)** — «Каханьне ў стылі барока».
**9 (сб)** — «Ромул Вялікі».
*Ранішнія спэктаклі*
**3 (ндз)** — «Паўлінка».
**10 (ндз)** — «Сьнежная каралева».
*Малая сцэна*
**2 (сб)** — «Балада пра каханьне».
**4 (пн)** — «Востраў Сахалін».
**7 (чц)** — «Адчыніце кантралёру».

**Тэатар юнага гледача**
**1 (пт)** — «Каліф–шавец».
**1 (пт)** — «Апошняя дуэль».
**2 (сб)** — «Шлях на Бэтлеем».
**2 (сб)** — «Сястра мая Русалачка».
**3 (ндз)** — «Маленькія трагедыі».
**3 (ндз)** — «Сястра мая Русалачка».
**6 (ср)** — «Тарас на Парнасе».
**7 (чц)** — «А зоры тут ціхія».
**8 (пт)** — «Якая стварыла цуд».
**8 (пт), 10 (ндз)** — «Залатое сэрцайка».
**9 (сб)** — «Пацалунак ночы».
**10 (ндз)** — «Дзень народзінаў ката Леапольда».

**Тэатар беларускай драматургіі**
*На сцэне Дому літаратараў*
**3 (ндз)** — «Адэль».
**6 (ср)** — «Жан і Бэатрыса».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Вечарына Генадзя

30 лістапада ў канфэрэнц–залі Палацу мастацтваў (вул.Казлова, 3) адбудзецца

## КІНО НА DVD

**Чатыры (4)**
Драма, Расея, 2005, рэж. **Ільля Хржаноўскі.**
У ролях: **Сяргей Шнураў, Ірына Воўчанка, Канстанцін Мурзенка.**
Прастытутка, музыка, мясьнік... Кожны выдае сябе за іншага, і кожны зьнітаваны таямнічай гісторыяй зь лічбай «4». Скандальная драма паводле сцэнара Ўладзімера Сарокіна.

**Гавань** (Haven).
Драма, ЗША, 2006, рэж. **Фрэнк Е.Флаўэрз.**
У ролях: **Біл Пэкстан, Арланда Блум, Зоі Салдана.**
На Кайманавых выспах хаваюцца бізнэсоўцы і палюбоўнікі. Але трывогі дасягаюць і зацішнае гавані. Ці вытрымае каханьне падзеньне раю?

**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**

## КАІСА

# Юбілейныя фантазіі

Зь юбілеем «Нашу Ніву» павіншаваў кобрынец Сьцяпан Давыдзюк, адзін з найбольш знакамітых шахматных трэнэраў Берасьцейшчыны, дый усёй Беларусі (сярод яго вучняў — гросмайстар Аляксей Аляксандраў). Настаўнік даслаў у Рэдакцыю свае новыя задачы; адна зь іх разьмешчаная на 100–клетачнай дошцы, а тры іншыя, з цэлым табуном коней, складаюць слова «СТО». Нашае яму дзякуй за арыгінальны падарунак!

**1.** С.Давыдзюк, 2006. Прысьвячаецца 100–годзьдзю «Нашай Нівы».

Мат за 3 хады (дададзены гарызанталі 9—10 і вэртыкалі i—j).

**2.** С.Давыдзюк, 2006. Прысьвячаецца 100–годзьдзю «Нашай Нівы».

«С» — каапэратыўны мат за 5 хадоў, «Т» — каапмат за 2 хады, «О» — каапмат за 3 хады.

***

**Адказы** на шахматную крыжаванку з №41.

**Па гарызанталі. 1.** Ананд. **4.** Лагвілава. **8.** Рух. **9.** Блеф. **10.** Пасад. **12.** Таск. **14.** Агзамаў. **16.** Неба. **18.** Капа. **19.** Ыйм. **21.** Гулько. **23.** Лойд. **24.** Ізорыя. **25.** Фэнікс. **26.** Каспараў.

**Па вэртыкалі. 1.** Алапін. **2.** Амос. **3.** Дырда. **4.** Лох. **5.** Вілка. **6.** Ліфт. **7.** Аляксандраў. **11.** Давыдзюк. **13.** Аба. **15.** Гадо. **17.** Болтан. **18.** Каляда. **20.** Мэрас. **21.** Граф. **22.** Крок.

Першым правільна на ўсе пытаньні адказаў Вадзім Жылко з Лунінца.





**Адказы:**

**1.** 1. Фс1 Кра8 2. Фс9 Крb7 3. Фс6Х; 2…b7 3. Кс7Х. 1…Кра6 2. Фс5 Кра5 3. Кс7Х; 2…b7 3. Кс7Х; 1…Крb6 2. Крb4 b7 3. Фh6Х; 2…Кра6 3. Фс6Х. Выбар «казачнай» дошкі не выпадковы, бо, як піша аўтар, «на 64–х клетках задачы «цесна», ёсьць дуаль. Пры стане белых Крb1, Фh6, Кb3, п. d3 і чорных Крb5, п. b6 пасьля 1. Фс1 ход 1…Кра4 сапсаваў бы задачу — белыя даюць мат і шляхам 2. Фс3, і пасьля 2. Кра2».

**2.** «С» — 1. Кра8 Крс6 2. Кра7 Крс7(d7) 3. Кра8 Крс8 4. Кра7 Кс6+ 5. Кра8 Кс7Х. Правільны мат. «Т» — 1. Кh8 Кd7 2. Крh7 Кf6Х. Ідэальны мат. «О» — 1. Кf3 Ке4 2. Крh1 Крf2 3. Кh2 Кg3Х. Ідэальны мат.

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.** Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перაказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў, зможа чытаць «НН» паўгоду.

# Дзякуй

**Г.К., Аляксандру Б., Л.Г., Надзеі М., Сямёну В., Уладзімеру В.** з Горадні.
**Юр'ю Г.** са Сьвіслацкага раёну.
**Аляксандру М.** з Кобрына.
**Алене Х.** з Наваполацку.
**Сяргею Ц.** зь Лепельскага раёну.
**В.П.** зь Мядзельскага раёну.
**Ігару С.** з Валожынскага раёну.
**Зьмітру К.** з Мастоўскага раёну.
**Т.Я.** з Маладэчна.
**Анатолю Б.** з Магілёва.
**Алене М.** зь Бярозаўскага раёну.
**Міхаілу Т.** са Слуцкага раёну.
**Дзянісу К.** з Гомелю.
**М.К., І.Ц.** з Жыткавіцкага раёну.
**А.П.** зь Берасьця.
**Мікалаю В.** з Пружанскага раёну.
**Юр'ю Б.** з Бабруйску.
**А.С., Вадзіму М., А.Л., Уладзімеру К., Але Г., З.С., Максіму К., В.Ш., А.Л., Т.В., Івану У., Н.А., Алегу А., А.М., Міхаілу Б., Леаніду Г., Віктару В., Н.З., Аляксандру П., Анатолю Г., Мікалаю У., Івану К., Л.Ф., Аляксею Ш., Паўлу Я., У.А., В.К., Эдуарду К., Сьвятлане Д., Вячаславу С., Юр'ю М., Але С., Д.К., Л.В., Т.П., А.Б.** зь Менску.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3015 212 000 012** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521
МГД ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3015 212 000 012** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць. На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

**...дэкрэт аб нядбайных бацьках пасьлядоўна праводзіўся ў жыцьцё.**

— А цябе за што на «хімію»?

— Камісія па справах непаўналетніх так вырашала: калі я Бацька, то ўсе быццам мае дзеці. А раз сярод іх мільён алькашоў і сто тысяч наркаманаў, то відавочна я не выконваю сваіх бацькоўскіх абавязкаў. Дзетак забралі, а мяне — на прымусовую працу.





**...пратэкцыянісцкая палітыка працягвалася.**

— Раптам пасярод лесу Чырвонакаптурка сустрэла шэрага ваўка.

— Бабуся, ну, «шэрыя мабільнікі» я яшчэ разумею, а нашто ваўкам патрэбная акцызная марка?

**...расейскія кандытэры хацелі прайсьці на беларускі рынак.**

— Не пускаюць нашы цукеркі праз аднолькавыя назвы прадукцыі. Кажуць, у іх ужо ёсьць «Мишка на Севере». Хвілінку. Дайце мне аддзел маркіроўкі. Калі ласка, перакладзіце ўсе надпісы на фанціках на беларускую. Быў «Мишка на Севере», будзе «Мядзьведзік на Поўначы». І глядзіце, каб ніякай там наркамаўкі. Выключна клясычны правапіс!



МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЕЛІКА УШКІНА

## Сабачыя гісторыі

У аднаго Сабакі сын займаўся бізнэсам. Грайдану таксама хацелася разбагацець, і ён паслаў тэлеграму Абрамовічу на Чукотку: «Я ўжо вырас і хачу пітацца чалавечаскімі яйцамі, а мне ўсё даюць бананы...»

* * *

Адзін Сабака ня мог жыць без Інтэрнэту. Граждан жыў бяз жонкі, і яму па начох мроіліся дзікія абізьяны, якія захапілі ўладу на сьвінафэрме «Красная сьвінаматка».

* * *

Адзін Сабака аб’явіў: «Асьцярожна, дзьверы адчыняюцца...» Граждан, пачуўшы гэта, ускрыкнуў: «А ў мяне ў газавай пліце памёр тараканша, які ўсю сваю засядацельную жызьню чакаў, пакуль я яго выпушчу іграць на патэльні ў хакей...»

* * *

Адзін Сабака трапіў у каналізацыю. А там Граждан: «У маёй падводнай лодцы няма стопкрану, таму вам давядзецца пітацца катлетамі на ўзьлётнай паласе мухі цэ-цэ...»

* * *

Адзін Сабака сабраў прэс-канфэрэнцыю для Гражданоў. Гражданы доўга цікавіліся сабачым жыцьцём, а самы цікаўны запытаўся: «А пачом у вас апілкі для аздараўленьня піларамы?»

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Анатолю А. зь Менску.** Вы ганіце «Сабачыя гісторыі», а іншым чытачам яны падабаюцца, таму спыняць іх ня будзем.

**Н.М-ай зь Менску.** Выдаць нумар газэты для бясплатнай раздачы не мяркуем. З розных прычынаў. Найперш дзеля таго, што атрыманьне спонсарскіх грошай на гэта зьменшыла б незалежнасьць газэты. Рабіць газэту дорага каштуе.

**Янаўчы Л. зь Менску.** Верш не для друку.

**Сьвятлане Р. зь Менску.** Тэорыі Гумілёва псэўданавуковыя. Ня варта на іх грунтавацца.

# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 30.**

# 12 сьнежня

Вялікі канцэрт

## «Бэніфэст» Анемпадыстава

## 19.00

**Клюб «Юла» (вул.Сурганава, 26)**

Удзел бяруць: Народны альбом, Apple Tea, Кася Камоцкая, Зьміцер Вайцюшкевіч, IQ48.

Даведкі па т.: 689–40–48, 778–82–77.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ЗНАЁМСТВЫ

**Хлопец 28 гадоў** пазнаёміцца зь беларускай дзяўчынай для сур’ёзных адносінаў. Т. 373–23–74, хатні 220–87–93, Сяргей

### ВІТАНЬНІ

**Усіх чытачоў** і Рэдакцыю «Нашай Нівы» віншую з 86–мі ўгодкамі Слуцкага збройнага чыну! Вечная слава героям! Усяслаў Цераўковіч

### КАНТАКТЫ

**Твой сьцяг** — бел–чырвона–белы? Твая мова — беларуская? Твой гімн — «Магутны Божа»? Тады Беларусь чакае ЦЯБЕ! www.mfront.net

**Шукаем** аматараў караоке для кансультацый. Т.: 649–08–88. pesni2006@tut.by

### МАБІЛА

**Набуду нядорага** патрыманую мабілку без наваротаў, каб працавала. Т.: 8–029–174–98–91

### ПРАЦА

**Невялікая праца** для перакладчыка з ангельскай (разуменьне багаслоўскага дыскурсу неабходнае). website@jamesalison.co.uk

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17–й. Т.: 017–235–18–72. Юрась

### ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае** ў сяброўскае падарожжа 17 сьнежня (нядзеля) па маршруце: Менск—Крывічы—Будслаў—Княгінін—Касьцяневічы—Куранец—Вязынь—Краснае—Менск. 23—24 сьнежня: Вільня—Коўна—Рушышкі. Т.: 292–54–58, 622–57–20, 110–19–28, 509–12–16

### МУЗЫКА

**Новыя альбомы** Віктара Шалкевіча «Гарадзенец прызямліўся ў Менску», «Чырвоным па белым», «Мясцовы час», Сяржук Сокалаў–Воюш, Данчык «Мы яшчэ сустрэнемся», кніга «222 альбомы беларускага року і ня толькі» і інш. Лістуйце на pesni2006@tut.by, а таксама зьвяртайцеся да незалежных распаўсюднікаў

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Маладэчна.** Бацькам маладэчанскіх сэмінарыстаў, выгнаных за забастоўку, дырэхтар сэмінарыі Цьвірка–Гадыцкі паслаў паперу, у каторай просіць бацькоў падаваць прашэньне, каб прынялі зноў у сэмінарыю дзяцей іх, і абяцуе прыняць. Некаторыя бацькі, не папытаўшыся ў сыноў сваіх, падалі Гадыцкаму прашэньні; але як сыны пачулі гэта, то патрэбавалі прашэньні аддаць ім назад, і гэтак Гадыцкі астаўся з носам.

Сакерка

**«Наша Ніва». №2. 1906.**

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам.галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а–112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2671. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 29.07.2006.
Замова № 6653.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а–112.